ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня XV
№ 104 (4356)
УТОРАК, 10 мая
1932 г.

МЕНСК, Савецкая 33

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Пастанову ЦК і СНК аб збожжазагатоўках — у масы.

Н. ЦЯРЭНЦЬЦЯЎ — Казкі аб «эканамічнай пустаце» разьвейваюцца. (2 стар.).

Н. НАУМАЎ — Асноўныя задачы агітацыйна-масавай работы (3 стар.).

Шырокай папулярызацыяй пастаноў ЦК УсеКП(б) і СНК аб збожжазага тоўках і пастановай ўраду аб с.-г. падатку мабілізаваць шырокія працоўныя масы вёскі на паскарэньне тэмпаў сяўбы і павышэньне ўраджайнасьці (1 стар.).

Дапаможам сталовым, жактам, школам і ЗРК у арганізацыі трусагадоўлі (2 стар.).

УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД ІТС — Узьняць марксыцка - ленінскае выхаваньне мас спэцыялістаў (3 стар.).

Прадвыбарчая спэкуляцыя францускай буржуазіі на сьмерці Думэра (4 стар.).

1-я сэсія ДВС БССР — Другая пяцігодка і задачы культурнага будаўніцтва (4 стар.).

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі (4 стар.).

ПАСТАНОВУ ЦК і СНК АБ ЗБОЖЖАЗАГАТОЎКАХ—У МАСЫ

Пазаўчора ў «Зьвязьдзе» апублікавана пастанова ЦК УсеКП(б) і СНК СССР «Аб пляне збожжазагатовак з ураджаю 1932 г. і разгортваньні калгаснага гандлю збожжам».

У гэтай пастанове партыяй і ўрадам даны дырэктывы па вырашэньні аднэй з важнейшых праблем народна-гаспадарчага пляну і далейшага разгортваньня калгаснага будаўніцтва.

Збожжавай гаспадарцы належыць адно з цэнтральных месц у сацыялістычнай эканоміцы нашай краіны. Недарма пртыя аддае гэтаму вучастку так многа ўвагі. **Вырашэньне збожжавай праблемы, няўхільны рост і ўзмацненьне збожжавай гаспадаркі складаюць вялізарную перамогу генэральнай лініі партыі, зьяўляюцца яркім доказам пераваг сацыялістычнай сыстэмы народнай гаспадаркі.**

Партыя выкрыла і абвергла «ўстаноўку» правых ухілістаў на вырашэньне збожжавай праблемы праз разьвіцьцё кулацкай гаспадаркі. Ва ўпартай барацьбе партыя перамагла супраціўленьне праваапартуністычных элемэнтаў, якія выконвалі сацыяльны заказ кулака і адмаўляліся ад разгорнутага сацыялістычнага наступленьня на капіталістычныя элемэнты.

Партыя дала рашучы адпор і «левым» апартуністам, якія сваімі заскокамі, авантурызмам, голым адміністраваньнем імкнуліся дыскрэдытаваць ідэі калектывізацыі і дапамагалі гэтым кулацкаму праваму ўхілу.

Да перамог на збожжавым фронце партыя прывяла краіну адзіна правільным шляхам—шляхам тэхнічнага ўзбраеньня сельскай гаспадаркі, шляхам разьвіцьця буйнага сацыялістычнага зямляробства, выконваючы стратэгічны плян саўгаснага і калгаснага будаўніцтва, вызначаны тав. **Сталіным**, ажыцьцяўляючы лёзунг ліквідацыі кулацтва як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі.

Паперакор прароцтвам правых апартуністаў, саўгасы і калгасы ня толькі ўжо замянілі кулацкую вытворчасьць, і кулацкае таварнае збожжа, але ператварыліся ў асноўных прадуктаўраў збожжа, а таксама асноўных відаў сырцу.

Апошнія два гады з асаблівай сілай падкрэсьліваюць посьпехі калгаснай і саўгаснай сыстэмы.

Калі ад ураджаю 1928 г., па аснове аднаасобнай гаспадаркі было загатоўлена 660 млн. пудоў збожжа, дык у 1930 г. дзяржаўныя загатоўкі дасягнулі ўжо 1.350 млн. пудоў, а ў 1931 г., ня гледзячы на засуху, загатоўлена 1.400 млн. пудоў. (Лічбы паказаны разам з гарнцам).

Павялічэньне харчовых рэсурсаў краіны ідзе ў нагу з няўхільным ростам прамысловай прадукцыі, з павялічэньнем фондаў тавараў шырокага спажываньня, што забясьпечвала непарыўнае павышэньне матар'яльнага ўзроўню рабочай клясы, калгасьнікаў і ўсіх працоўных мас Савецкай краіны.

Усе гэтыя грандыёзныя посьпехі СССР з выключнай рэзкасьцю абгаляюць жудасны малюнак становішча капіталістычных краін.

Там усё мацней і мацней сьціскаюцца ціскі эканамічнага крызісу, які пераплятаецца з аграрным. Там тэхнічны прагрэс прыходзіць у непрымірымую супярэчнасьць з капіталістычным спосабам вытворчасьці. Там аграрэхніка толькі абвастрае барацьбу за збыт сельска-гаспадарчых прадуктаў, яшчэ больш зьніжае цэны на хлеб, цягне ў першую чаргу разбурэньне дробных зямляробаў. Перавытворчасьць збожжа, вымушанае крызісам скарачэньне вытворчасьці—біч, які параджае беспрацоўе, голад і галечу сярод найшырэйшых мас працоўнага насельніцтва. Такавы плады дзьвёх процілеглых эканамічных сыстэм.

Гаспадарчы рост калгасаў ішоў **на аснове ленінскай палітыкі партыі, якая забясьпечвала на ўсім працягу калгаснага будаўніцтва вялікую матар'яльную дапамогу калгасам.**

Новы закон аб с.-г. падатку і пастановы ЦК і СНК аб збожжазагатоўках зьяўляюцца далейшым буйным крокам па шляху ажыцьцяўленьня гэтай палітыкі.

Пяма ніводнай капіталістычнай краіны, дзе-б падаткі не расьлі шалёнымі тэмпамі. У Савецкім саюзе, ня гледзячы на значнае павялічэньне грашовых даходаў сельскага насельніцтва (з 13,2 млрд. руб. у 1930 г. да 22,4 млрд. у 1932 г.), ня гледзячы на далейшае павялічэньне ў гэтым годзе капітальных укладаньняў у сельскую гаспадарку (з 3.600 млн. руб. да 4.306 млн. руб.)—разьмеры сельгаспадатку ў 1932 г. не павышаюцца, а застаюцца на ўзроўні мінулага году. **Калгасы паводле закону аб с.-г. падатку атрымліваюць шматлікія новыя ільготы.** Усе паступленьні ад с.-г. падатку ідуць у мясцовыя сродкі па сельскіх раёнах і гарадзкіх саветах.

Важнейшым мерапрыемствам у гэтым-жа напрамку зьяўляецца пастанова ЦК і СНК **аб зьмяншэньні збожжазагатовак па калгасным сэктары і аднаасобных гаспадарках на 264 млн. пудоў.** Па БССР агульны плян збожжазагатовак зьменшан з 6 да 4 млн. пудоў. Гэтай пастановай яшчэ раз з усёй паўнатой пацьвярджаецца, што партыя і ўрад скарыстоўваюць усе магчымасьці, усе дасягненьні народнай гаспадаркі для аказаньня максымальнай дапамогі і ўздыму матар'яльнага становішча працоўных мас вёскі і ў першую чаргу калгаснага сялянства.

Пастанова ЦК і СНК адначасова ўносіць **новае** і ва ўсю сыстэму збожжазагатовак. Скарачэньне пляну загатовак па калгасах стварае ў апошніх дадатковыя рэсурсы збожжа, якія, **пасьля выкананьня абавязкаў перад пралетарскай дзяржавай,** могуць скарыстоўвацца калгасамі і калгасьнікамі ў якасьці таварнай прадукцыі. Гэта ў сваю чаргу, пры ўсё ўзрастаючай колькасьці прамтавараў, пашырае пэрспэктывы забесьпячэньня гарадоў хлебам непасрэдна праз гандаль калгасаў і калгасьнікаў.

«Савецкая ўлада атрымала магчымасьць, побач з мэтадам дзяржаўных збожжазагатовак, практыкаваць, як сродак снабжэньня гарадзкога насельніцтва, другі мэтад — мэтад гандлю збожжам самымі калгасамі і калгасьнікамі.» (З пост. ЦК і СНК).

Такім чынам, **разьвіцьцё і ўзмацненьне калгаснага гандлю збожжам становіцца адным з важных зьвеньняў таваразвароту паміж горадам і вёскай, адным са сродкаў арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, паляпшэньня рабочага снабжэньня.**

Задачы разгортваньня калгаснага гандлю збожжам непарыўна зьвязаны **з усёй** збожжазагатоўчай работай. Зьмяншэньне пляну збожжазагатовак па калгасным сэктары, прадастаўленьне калгасам і калгасьнікам магчымасьці, **пасьля выкананьня загатоўчых плянаў і стварэньня насенных фондаў** рэалізаваць лішкі збожжа праз калгасны гандаль — усё гэта стварае магутны стымул для сваячасовага і поўнага выкананьня калгасамі сваіх абавязальстваў перад пралетарскай дзяржавай.

Але было-б глыбока памылковым думаць, што арганізацыйна-масавая работа вакол збожжазагатовак можа быць хаця-б у якой-небудзь ступені, аслаблена. **Трэба ясна бачыць, што збожжазагатоўкі ў гэтым годзе будуць праходзіць ва ўмовах жорсткай клясавай барацьбы, ва ўмовах шалёных спроб кулацтва сарваць вызначаныя пляны.** Нельга забываць, што іменна барацьба з кулаком і яго агентурай—апартуністамі, вялізарная арганізацыйна-масавая работа, праведзеная партыяй, барацьба з апартуністычным самацёкам, з праяўленьнямі буржуазных тэндэнцый у асобных зьвеньнях саўгаснай сыстэмы, з кулацка-рвацкімі настроямі сярод асталых пластоў калгасьнікаў—вось што забясьпечыла посьпех леташніх збожжазагатовак. Гэта барацьба, гэта работа зусім ня зьнімаецца і зараз.

Перад партыйнымі арганізацыямі і калгаснай сыстэмай стаіць вельмі сур'ёзная, адказная задача па разгортваньні калгаснага гандлю збожжам. Нельга не адзначыць, што ў БССР у галіне разьвіцьця калгаснага гандлю цаогул зроблена яшчэ надзвычай мала. У радзе месц ёсьць **яўная недаацэнка** гэтага мерапрыемства. Тут яшчэ прадстаіць вялікая работа. Трэба па баявому ўзяцца за разгортваньне калгаснай гандлёвай сеткі, падрыхтаваць усе ўмовы для пасьпяховага разьвіцьця калгаснага гандлю збожжам з новага ўраджаю.

Партыйныя і калгасныя арганізацыі павінны з усёй сур'ёзнасьцю адносьціся да ўказаньня ЦК і СНК аб тым, што задачы разьвіцьця калгаснага гандлю настойліва абавязваюць **«прыняць меры да выкараненьня прыватнікаў і перакупшчыкаў-спэкулянтаў, якія прабуюць нажывацца на калгасным гандлі».** Выкананьне гэтага ўказаньня ЦК і СНК зьяўляецца адной з важнейшых прадпасылак пасьпяховага разьвіцьця калгаснага гандлю і патрабуе **глыбокай растлумачальнай, выхаваўчай работы сярод калгасных мас.**

Партарганізацыі павінны будуць разгарнуць барацьбу за бязумоўнае выкананьне вызначаных пастановай **тэрмінаў завяршэньня збожжазагатовак і стварэньне насенных фондаў.** Збожжазагатоўчыя пляны ўзабходна выкананць не пазьней 1 студзеня і стварыць насенныя фонды не пазьней 15 студзеня 1933 г.

Узрастаюць задачы перад нашымі саўгасамі. Выходзячы з росту і ўзмацненьня саўгаснай сыстэмы, пастанова ЦК і СНК **павялічвае** ў бягучым годзе плян збожжазагатовак па саўгасах амаль на 40 проц. Гэта патрабуе ад саўгасаў сапраўды ўдарных тэмпаў работы, бальшавіцкай барацьбы за кожны лішні засеяны гектар, за максымальны ўздым ураджайнасьці.

Пастанова ЦК і СНК зьяўляецца дакумантам першаступовай гаспадарча-палітычнай важнасьці. **Партарганізацыі абавязаны неадкладна разгарнуць вакол гэтай пастановы, а таксама і новага закону аб с.-г. падатку найшырэйшую растлумачальную работу.** Пастанова ЦК і СНК аб збожжазагатоўках і новы закон аб с.-г. падатку зьяўляюцца магутным вагаром мабілізацыі калгасьнікаў, рабочых саўгасаў і МТС, а таксама бядняцка-серадняцкіх мас аднаасобнікаў **на выкананьне і перавыкананьне плянаў сяўбы, на падрыхтоўку да ўборкі ўраджаю.** Кожнае практычнае мерапрыемства, зьвязанае з сяўбой, павінна шчыльна ўвязвацца з папулярызацыяй пастановы ЦК і СНК. Кожны калгасьнік, кожны бядняк і серадняк—аднаасобнік павінны падрабязна даведацца аб новых ільготах у с.-г. падатку, аб пастанове ЦК і СНК па збожжазагатоўках, каб зрабіць адсюль практычныя вынікі, каб з падвоенай энэргіяй змагацца за пляны сяўбы.

Па-бальшавіцку правядзем пастанову ЦК і СНК у жыцьцё, забясьпечым гэтым новыя перамогі ў выкананьні народна-гаспадарчага пляну, ператварэньні БССР у перадавую індустрыяльна-аграрную краіну.

ШЫРОКАЙ ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЯЙ ПАСТАНОЎ ЦК УсеКП(б) і СНК АБ ЗБОЖЖАЗАГАТОЎКАХ І ПАСТАНОВЫ ЎРАДУ АБ С.-Г.ПАДАТКУ

мабілізаваць шырокія працоуныя масы вескі на паскарэньне тэмпау сяубы і павышэньне ураджайнасьці

ТРАКТАРНАМУ І КОНСКАМУ ПАРКУ—ПОУНУЮ НАГРУЗКУ!

Правільна арганізаваць работу на кожным вытворчым вучастку МТС

На 5 мая па БССР 44 МТС пачалі сяўбу. 13 МТС па невядомых прычынах сяўбу не разгарнулі (Бялыніцкая, Бешанковіцкая, Боркавіцкая, Ветрынская Дубровенская, Полацкая, Сураская, Шклоўская Бягомльская, Хутчынская (Койданаўскі раён), 2-ая Менская, Барысаўская і г. д.).

Паводле апошніх даных, усімі МТС засеяна 9.603 га, або 0,9 проц. да агульнага пляну. У тым ліку засеяна збожжавых—6282 га (3,9 проц.), бабовых—899 га (4,6 проц.), ільну — 247 га (0,8 проц.), канапель—80 га (0,1 проц.), траў—376 га (0,7 проц.) і гародных культур — 47 га (0,3 проц.).

Прыведзеныя лічбы гавораць аб яўна нездавальняючых тэмпах сяўбы па МТС, асабліва, калі прыняць пад увагу, што па БССР плян сяўбы выкананп на 3,3 проц., а па МТС—усяго на 1,9 проц.

Прычыну гэтага адставаньня трэба шукаць у першую чаргу ў дрэнная арганізацыі працы. На сёнешні дзень ня ўсе МТС скончылі вылучэньне вытворчых вучасткаў і арганізацыю трактарных атрадаў. Так, Бялыніцкая, Лельчыцкая і Путчынская (Койданаўскі раён) МТС толькі цяпер, у разгар сяўбы, праводзяць арганізацыю трактарных атрадаў. Пасьля гэтага ня дзіва, што Бялыніцкая і Путчынская МТС не прыступілі да сяўбы.

Дрэнная арганізацыя працы ў некаторых МТС таксама зьяўляецца прычынай нерацыянальнага скарыстаньня трактарнага парку, і нізкай прадукцыйнасьці трактараў.

Прыкладам ганебных адносін да скарыстаньня трактараў можа служыць Лагойская МТС, дзе 6 трактараў стаяць без работы. Кіраўнікі МТС тлумачаць гэта празмернай вільготнасьцю глебы. Між тым, нічога ня робіцца для таго, каб перакінуць трактары ў тыя калгасы, дзе ўжо можна праводзіць сяўбу. Чаго варты і такі факт, што напрыклад, Вушацкая МТС, якая за 9 дзён засеяла толькі 84 га —9 га ў дзень пры наяўнасьці 20 трактараў, Гарадоцкая за 7 дзён — 4 га па 1,75 га ў дзень пры наяўнасьці 29 трактараў.

Побач з адставаньнем некаторых МТС, мы маем і такія, як Даманавіцкая (Мазырскі раён), якая ўжо засеяла 1.725 га і выкапала плян на 27,8 проц., Жыткавіцкая—на 13,7 проц.

Прыклады перадавых МТС паказваюць, што ніякія спасыланьні на аб'ектыўныя прычыны ня могуць служыць апраўданьнем марудных тэмпаў сяўбы. Усе ўмовы для разгортваньня сяўбы ёсьць. Трэба толькі правільна расставіць сілы, правільна арганізаваць працу кожнага трактарнага атраду на вытворчым вучастку, ліквідаваць абязьлічку і ўраўнілаўку. На аснове рэалізацыі шасьці гістарычных умоў тав. Сталіна МТС павінны дабіцца ў бліжайшыя дні карэннага зруху ў ходзе сяўбы.

Задача ўсіх раённых арганізацый і кожнай МТС—неадкладна ліквідаваць недахопы, якія выяўлены ў першыя дні сяўбы. Забясьпечыць поўную нагрузку ўсяго трактарнага і конскага парку, наладзіць рамонт трактараў у полі, завезьці гаручае і змазачнае і забясьпечыць рацыянальнае скарыстаньне кожнага трактара. Мабілізаваць усю грамадзкасьць МТС на ўдарнае правядзеньне сяўбы і павышэньне ўраджайнасьці сацыялістычных палёў.

Апошнія пастановы ЦК УсеКП(б) і ўраду аб збожжазагатоўках і с.-г. падатку на 1932 г. зьяўляюцца магутнымі вагарамі ў барацьбе за далейшае арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, выкапаньне і перавыкапаньне сельска-гаспадарчага пляну чацьвертага, заключнага году пяцігодкі.

Давесьці гэтыя пастановы да калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас аднаасобнікаў—баявая задача ўсёй партарганізацыі і кожнага работніка МТС.

Заданьні партыі і ўраду МТС аб засеве 500.000 га яравога кліну зьяўляюцца рэальнымі, плян сяўбы павінен быць выкапан у тэрмін.

Зводка Трактарацэнтру

аб ходзе сяўбы па МТС БССР на 5 мая 1932 году

Назва МТС	План яравой сяўбы	Усяго засеяна засеяна	Проц. выканаьня
ІЛЬНЯНА - ЖЫВЁЛАГАДОЎЧЫЯ			
Асьвейская	6931	229	3,2
Бялыніцкая	—	—	—
Бешанковіцкая	9814	—	—
Боркавіцкая	7657	—	—
Ветрынская	9124	—	—
Горацкая	14049	162	1,1
Гарадоцкая	7872	4	—
Дрысенская	7005	22	0,3
Дубровенская	10645	—	—
Крупская	6793	35 5	0,5
Лепельская	14317	6[illegible]	0,4
Лепельская	143	6[illegible]	0,4
Мсьціслаўская	11271	86	0,7
Полацкая	7859	—	—
Расонская	8095	5[illegible]	0,6
Сіроцінская	8620	19	0,2
Сураская	6488	—	—
Сененская	133[illegible]3	11[illegible]	0,9
Талочынская	[illegible]	[illegible]	—
Вушацкая	9090	43	0,4
Чашуская	7873	84	1,0
Чашніцкая	7388	50	0,6
Шклоўская	9889	—	—
ЖЫВЁЛАГАДОЎЧА - БУЛЬБЯНЫЯ			
Бягомльская	9003	—	—
Б.-Капашёўская	9666	328	3,4
Вузьдзенская	8003	698	8,7
Заслаўская	12553	125	1,0
Жлобінская	6644	646	9,7
Касьцюковіцкая	10012	324	3,2
Клімавіцкая	15790	145	0,9
Койданаўская	15732	820	5,2
Капыльская	9243	162	1,7
Лагойская	8797	20	0,2
Плешчаніцкая	6496	28	0,4
Пухавіцкая	8468	115	1,3
Рагачоўская	5947	114	1,9
Слуцкая	8793	432	4,9
Смалявіцкая	11736	113	0,9
Ст.-Дароская	5723	33	0,5
Тапежыцкая	7783	406	5,2
Цялуская	7350	306	4,1
Церахаўская	9682	18	0,2
Пучынская	8757	—	—
Менская II-я	9666	—	—
ЖЫВЁЛАГАДОЎЧА-КАНАПЛЯНЫЯ			
Дамановіцкая	6274	1725	27,8
Жыткавіцкая	5404	742	13,7
Лельчыцкая	3447	258	7,5
Старобінская	7339	214	2,9
Тураўская	2582	153	5,9
САДОВА - ГАРОДНЬЯ			
Аршанская	9828	12	0,1
Барысаўская	6890	—	—
Віцебская	7037	—	—
Гомельская	7134	155	2,1
Менская	7839	137	1,7
Магілеўская	7113	8	—
Рэчыцкая	7377	63	0,8
Хойніцкая	6422	309	4,8
Умяго па ўсіх МТС	485173	9503	1,9

УВАГА: 1) У плян яравой сяўбы падсечная канюшына не ўваходзіць.
2) Полацкая, Сураская, От.-Дароская, Лельчыцкая, Барысаўская, Віцебская і Рэчыцкая МТС на 5 мая —вестак не прадставілі.

Агранам-плянавік Трактарацэнтру САПЕГА.
Статыстык — КІРШЭЎСКАЯ.

Слуцкая МТС не арганізавала дастаўку гаручага і змазачнага

СЛУЦАК. Першыя вынікі сяўбы па калгасах, якія абслугоўваюцца Слуцкай МТС, выяўляюць цэлы рад вялікіх тормазаў. Па 48 калгасах МТС яравы клін — 10.300 га. З наяўнай цягавай сілай — 1.805 рабочых коняй і 30 трактараў, МТС мае поўную магчымасьць ісьці ў авангардзе посеўнай кампаніі.

Трактарны парк адрамантован зусім нядобраякасна, у выніку 8 трактараў у момант выхаду ў поле аказаліся непрыгодным да працы і патрабуюць новага рамонту. Рэшта трактараў накіраваны ў калгасы. Але карысьці ад гэтага няма. Некаторыя з-за дрэннага рамонту стаяць нерухомымі («Камінтэрн»).

У першыя-ж дні сяўбы ўжо выяўляецца безалаберщына ў дастаўцы гаручага і змазачнага. 5 мая калёна № 3 (Ів. Гародніцкі сельсавет) з 4 трактараў зрабіла прастой толькі таму, што ня было дастаўлена гаручае.

Галоўнае зьвяно — вытворчы вучастак МТС — яшчэ не замацован. Патрэбна 5 загадчыкаў вучасткаў, ёсьць толькі 3. 2 вучасткі фактычна ня маюць кіраўнікоў, хто-б адказваў за іх работу.

Скажэньне дырэктыў партыі ў арганізацыі палявых калгасных брыгад таксама затрымлівае тэмпы сяўбы на калгасах, якія абслугоўваюцца МТС. У калгасе «Хваля рэвалюцыі» на першы погляд брыгады ёсьць. Сельсавет рапартуе праз газэту «Леніскі шлях» што брыгады ва ўсіх калгасах створаны. Старшыня калгасу на запытаньне, колькі створана брыгад, адказвае: 2 паливы, 1 садова-гародная. А калі ў брыгадзіра **Караневіча В.** запыталі — колькі ў твaёй брыгадзе людзей,— дык ён адказвае: «Як калі патрэбна. Сёньня трэба на бульбу больш, даюць больш». І, парэшце, Караневіч заканчвае: «Прыстасоўваемся да плошчы і перагранням людзей з брыгады ў брыгаду». Толькі цяпер становіцца ясна, што тут зямля абязьлічана, за ўраджай ніхто не адказвае.

Радковая сявярка ў калгасе «Хваля рэвалюцыі» не скарыстоўваецца па той прычыне, «быццам па іх полі яна непрыгодна». Справа ясная, дзе людзі ўпарта ня хочуць выконваць дырэктыў партыі па арганізацыі працы, там няма сур'ёзнай барацьбы за ўраджай.

Неабходна ў бліжэйшыя дні, каб райком партыі ўмацаваў МТС вытрымаными партыйцамі (загадчыкі вучасткаў), каб можна было гаварыць аб Слуцкай МТС, **як** арганізатару сацыялістычнай сельскай гаспадаркі.

Пачын рэдакцыі раённай газэты «Леніскі шлях», якая на час сяўбы арганізавала выязную рэдакцыю ў МТС з выданьнем трохдзённай шматтыражкі, павінен быць падтрыман, а таксама і размножан другімі раённымі газэтамі.

Б. Х.

Віцебская МТС паказвае ўзоры арганізацыі калгаснай вытворчасьці

ВІЦЕБСК. (Наш спэц. кар.).

Віцебская машына - трактарная станцыя арганізавана зусім нядаўна. МТС абслугоўвае 36 калгасаў з садова- гародня - жывёлагадоўчым напрамкам. Увесь трактарны парк забясьпечан запаснымі часткамі і гаручым матар'ялам . МТС разам з райкалгассаюзам правяла курсы. Выпушчаны 132 трактарысты.

Кожная трактараная брыгада мае сваё вытворчае заданьне і нормы выпрацоўкі.

Значную работу правяла МТС у галіне забясьпячэньня сваіх калгасаў насеньнем, у якіх адчуваўся вялікі недахват. МТС паслала свайго прадстаўніка ў Паўночны Каўказ, дзе была зроблена загатоўка насеньня і ў выніку калгасам былі даны дзьве тоны насеньня гуркоў, 2 цэнт. сталовых буракоў і іншая гародніна. Зараз калгасы МТС поўнасьцю забясьпечаны насеньнем збожжавых культур і гароднінай. Праўда, бульбай калгасы забясьпечаны на 70 проц. Горшая справа з забясьпячэньнем насеньня вікі, якога ёсьць 60 проц. і канюшыны — 16 проц. Для канчатковай ліквідацыі прарыву зараз вядзецца ўзмоцненая работа па мабілізацыі ўнутраных насенных рэсурсаў праз унутрыкалгасную пазыку .

Віцебская МТС з посьпехам правяла кантрактыцыю гародных і іншых культур. Уся работа па кантрактацыі была цесна ўвязана з барацьбой за павышэньне ўраджайнасьці. Для таго, каб забясьпечыць выкананьне заданьня па закантрактаванай прадукцыі, работнікі МТС узялі на сябе абавязак — давесьці ўраджайнасьць збожжавых культур да 8,6 цэнтн., бульбы — 15 тон, ільну — 0,3 цэнт. і кораньплодаў — 30 тон. На закантрактаваную прадукцыю ўжо заключаны дагавары са спажыўкааперацыяй і віцебскім аддзяленьнем плодагародніны.

Ва ўсіх калгасах дзейнасьці МТС арганізаваны вытворчыя брыгады, да якіх даведзены вытворчыя пляны. Мінэральнае ўгнаеньне поўнасьцю завезена ў калгасы. Да кожнага вытворчага вучастку прымацован аграном. МТС разам з райкалгассаюзам правяла курсы, з якіх выпушчана 30 спэцыялістаў - садовагароднікаў.

Узорная падрыхтаванасьць МТС да сяўбы забясьпечыла своечасовы пачатак сяўбы ва ўсіх калгасах МТС. Але побач з гэтым у рабоце МТС ёсьць яшчэ і недахопы і адзін з вялікіх недахопаў гэта тое, што МТС яшчэ не пераключылася на абслугоўваньне прыгарадных гаспадарак. МТС таксама ня выканала заданьня па пасадцы ягаднікаў. Сярод трактарыстаў яшчэ слаба разгорнута сацыябарэніцтва і ўдарніцтва.

Арк. Зарубежны.

ПАСТАНОВА ЦК УсеКП(б) і СНК СССР АБ ЗБОЖЖАЗАГАТОЎКАХ—МАГУТНЫ ВАГАР АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧАГА ЎМАЦАВАНЬНЯ КАЛГАСАЎ

ПАСТАНОВА БЮРО МЕНГАРКОМУ КП(б)Б АД 9 МАЯ 1932 г.

Надаючы вялізарнейшае палітычнае значэньне пастанове ЦК УсеКП(б) і СНК аб пляне збожжазагатовак з ураджаю 1932 году і разгортваньні калгаснага гандлю хлебам, апублікаванай у «Правде» ад 7 мая г. г., якая «адкрывае сабой новую старонку ў збожжазагатоўчай палітыцы партыі», менгарком КП(б)Б **пастанаўляе:**

1. Пастанову ЦК УсеКП(б) і СНК СССР давесьці да кожнага рабочага, калгасьніка, аднаасобніка—бедняка і серадняка, для чаго:

партыйным ячэйкам і парткалектывам гораду на чарговых партыйных сходах прапрацаваць пастанову ЦК і СНК і ў парадку шэфскай работы дапамагчы падшэфным калгасам у яе прапрацоўцы.

Прапанаваць усім сельскім ячэйкам неадкладна арганізаваць масавую прапрацоўку пастановы ЦК і СНК і новага закону аб с.-г. падатку на 1932 год па ўсіх калгасах, вёсках, зрабіўшы іх магутным вагаром па далейшым арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, вагаром для пасьпяховага выкананьня і перавыкананьня ў найкарацейшы тэрмін пляну веснавой сяўбы і рашучага разгортваньня калгаснага гандлю.

Прапрацоўку скончыць да 20 мая г. г.

2. Прапанаваць упаўнаважаным менгаркому КП(б)Б па пасеўнай кампаніі неадкладна ўключыцца ў прапрацоўку пастановы ЦК і СНК і новага закону аб с.-г. падатку.

3. Культпропу забясьпечыць прапрацоўку пастановы ЦК і СНК у сетцы партасьветы гораду і вёскі.

4. Работа партыйных ячэек і сельсаветаў па правядзеньні пастановы ЦК і СНК у жыцьцё будзе менгаркомам КП(б)Б вымярацца перш за ўсё тым, у якой ступені яны гэтую пастанову змогуць скарыстаць для далейшага арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, паскарэньня тэмпаў пасеўнай, выкананьня і перавыкананьня пасеўных плянаў і арганізацыі калгаснага гандлю.

5. Даручыць фракцыям гарсавету і райкалгассаюзу ўнесьці на чарговае пасяджэньне бюро (15 мая) канкрэтныя мерапрыемствы па арганізацыі збожжазагатовак і разгортваньні калгаснага гандлю на падставе пастановы ЦК і СНК.

100 МЛРД. КІЛЁВАТ-ГАДЗІН ЭЛЕКТРАЭНЭРГІІ У 1937 г.

На канфэрэнцыі па складаньні генэральнага пляну электрыфікацыі СССР

МАСКВА. 7 мая ўвечары адкрылася канфэрэнцыя па складаньні генэральнага пляну электрыфікацыі СССР. На канфэрэнцыі створана 8 сэкцый: па **электрыфікацыі раёнаў, прамысловасьці, транспарту, сельскай гаспадаркі, быту і камунальнай гаспадарцы, сэкцыі энэргабсталяваньня электрастанцый і сетак, а таксама энэргарэсурсаў і кадраў.**

На ранішнім пасяджэньні 8 мая прыняты быў заслухан даклад **тав. Ломава** аб устаноўках па складаньні генэральнага пляну электрыфікацыі СССР і разьмяшчэньні прадукцыйных сіл у другім пяцігодзьдзі.

Пасьля 10 год, — сказаў **тав. Ломаў**, — СССР дабіўся вялізарных посьпехаў у справе электрыфікацыі нашай народнай гаспадаркі. Калі ў дарэвалюцыйнай Расіі спажываньне электраэнэргіі на душу насельніцтва дасягнула да **44,4 квт. - гадзін**, дык у 1932 годзе яно павінна выявіць ня ўжо ў **103 квт. - гадзін** на душу насельніцтва. Усё-ж мы яшчэ моцна адсталі ад другіх краін, дзе падушнае спажываньне электраэнэргіі ў 1928 годзе складала ў ПАЗШ **942 квт.-гадзіны**, у Германіі — **480 квт. - гадзін**, у Англіі — **337 квт. - гадзін**, у Францыі — **319 квт. - гадзін.** Згодна дырэктыў XVII партканфэрэнцыі, у 1937 годзе мы павінны вырабіць ня менш **100 млрд. квт. - гадзін**, давёўшы душавое спажываньне энэргіі да **550 квт. - гадзін**, устаноўленую магутнасьць электрастанцый да **22 млн. квт. - гадзін** (уключаючы неабходныя рэзэрвы да 24 - 25 млн. квт.-гадзін). Гэта будзе азначаць, што мы перагонім у другой пяцігодцы ўсе краіны, за выключэньнем ПАЗШ. Агульнае намячэньне ўсяго генэральнага пляну электрыфікацыі СССР акрэсьлівае арыентовачна ўстаноўленую магутнасьць электрастанцый СССР у 50 - 60 млн. квт.

Асноўны ўпор у складаньні пляну электрыфікацыі неабходна, апрача таго, зрабіць на разьмяшчэньне новых прамысловых станцый, максымальнае павялічэньне гідра - энэргетычных установак у нашай краіне. Будаўніцтва гідрастанцый ў нашых умовах заслугоўвае асаблівай увагі, паколькі яны ўносяць поўны пераварот ва ўсю гаспадарку раёну шляхам камбінаванага выкарыстаньня цэлага ряду паборотных праблем, як рэгуляваньне суднаходзтва, ірыгацыі ў засушлівых мясцовасьцях і г. д. Перад намі стаіць задача ўкараненьня электраэнэргіі ва ўсіх галінах гаспадаркі. Аўтаматызацыя вытворчых працэсаў на базе электрыфікацыі, укараненьне электразваркі, электрыфікацыі сельскай гаспадаркі, птушкагадоўчых фэрм, жывёлагадоўчых саўгасаў, малочнай гаспадаркі, электрыфікацыі хатняй гаспадаркі, пральнай справы, фабрык - кухань і г. д. — усё гэта павінна даць нам сапраўдную тэхнічную рэвалюцыю, стваральчы магутны фактар павышэньня грамадзкай прадукцыйнасьці працы.

Асабліва рэзкі крэн неабходна зрабіць у электрыфікацыі **чыгуначнага транспарту** з тым, каб да канца другой пяцігодкі вывесьці яго з таго вузкага мозца, у якім ён зараз знаходзіцца.

Наступным фактарам зьяўляецца максымальная цэнтралізацыя вытворчасьці электраэнэргіі, часткова цяпер. Будаўніцтвам цеплаэлектрацэнтраляй, перадачай электратоку на сотні кілёмэтраў вырашаецца цэлы рад важнейшых праблем у нашай народнай гаспадарцы. Уся колькасьць цеплаэлектрацэнтраляй павінна быць роўнай у 1937 годзе **150 адзінкам** пры магутнасьці кожнай ад 25 да 150 тысяч кілёват. Набудова такой цеплафікацыйнай магутнасьці паставіць СССР па камбінаваных мэтадах вытворчасьці электраэнэргіі **на першае месца ў сьвеце.**

Дэлегацыя навуковых працаўнікоў у М. М. Галадзеда

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. М. Галадзед прыняў дэлегацыю ад навуковых работнікаў БССР, якая вітала яго з пяцігадовым юбілеем са дня прызначэньня на пасаду старшыні СНК БССР.

У сваім прывітаньні прафэсар Шлікер, А. А., сказаў:

— Загартаванаму бальшавіку, вытрыману ленінцу ад навуковых работнікаў БССР шчырае прывітаньне. Пры вашым удзеле, Мікалай Мацьвеевіч, пад кіраўніцтвам партыі, культурнае будаўніцтва ў БССР значна ўзрасло. Даводзіцца ад імя вучоных БССР выказаць упэўненасьць у тым, што вы і надалей будзеце весьці непрымірымую барацьбу за генэральную лінію партыі, за культурную рэвалюцыю — зьяўляючыся на фронце і пралетарскую на зьмесьце.

— Я вельмі рад, — адказаў Мікалай Мацьвеевіч, — што навуковыя работнікі БССР аказалі мне гонар вітаць мяне з пяціг

Змагацца з коснымі адносінамі да важнейшага вучастку пасеўных работ

Гарачую страву даставіць на месца работы кожнай палявой брыгады

Грамадзкае харчаваньне--на калгасныя і саўгасныя палі

У барацьбе за павышэньне прадукцыйнасьці працы рабочых саўгасаў і калгасьнікаў у пэрыяд веснавой пасеўнай кампаніі вялізарную ролю павінна адыграць наладжваньне сацыяльна - бытавога абслугоўваньня і ў першую чаргу грамадзкага харчаваньня.

Добра арганізаванае грамадзкае харчаваньне ў калгасах дасьць магчымасьць уцягнуць у вытворчую працу ўсіх працаздольных калгасьнікаў і калгасьніц, а ад гэтага залежыць пасьпяховае правядзеньне палявых работ.

Да веснавых работ на саўгасных і калгасных палёх Белкаапхарч павінен быў арганізаваць 1.457 пунктаў калектыўнага харчаваньня і 589 стацыянарных сталовак.

На сёньняшні дзень, паводле даных Белкаапхарчу, толькі па Гомельскім, Бялыніцкім, Бабруйскім, Крупскім, Мсьціслаўскім, Чэрыкаўскім і Смалявіцкім раёнах разгорнута работа па арганізацыі палявых пунктаў калектыўнага харчаваньня. У астатніх-жа раёнах райсаюзы і райкалгассаюзы нічога ня робяць у гэтым напрамку. Яркі прыклад апартуністычных адносін да грамадзкага харчаваньня ў саўгасах і калгасах паказвае Хойніцкі райсаюз, які адмаўляецца арганізаваць сталоўку ў саўгасе «Рудакова». Гэты-ж хойніцкі райсаюз арганізацыяй калектыўнага харчаваньня ў калгасах дагэтуль займаўся толькі на паперы.

Хойніцкі райсаюз не адзін. Глускі, Дубровенскі, Рагачоўскі і цэлы рад іншых сваёй непаваротлівасьцю ў арганізацыі грамадзкага харчаваньня стваюць перашкоды пасьпяховаму правядзеньню трэцяй бальшавіцкай сяўбы.

На сёньняшні дзень па саўгасах Беларусі адкрыта 30 новых сталовак і 36 пунктаў палявога харчаваньня. Гэта ўсяго 28 проц. пляну. У калгасах замест 1.356 пунктаў арцельнага харчаваньня адкрыта 445.

Далёка ня ўсё зроблена Белкаапхарчам па забесьпячэньні новых сталовак інвэнтаром і кадрамі. Аднак, і на мясцох, у саўгасах і калгасах, ня выкарыстаны ўсе ўнутраныя рэсурсы па забесьпячэньні сталовак патрэбным начыньнем.

Без рашучага павароту мясцовых прафсаюзных арганізацый да грамадзкага харчаваньня ў саўгасах і калгасах, без забесьпячэньня канкрэтнага кіраўніцтва райкомаў і ячэек КП(б)Б пастаўленыя задачы ня будуць як сьлед выкананы.

Арганізацыя грамадзкага харчаваньня на полі — важнейшая частка барацьбы за пасьпяховую сяўбу. Абавязак кожнай парт'ячэйкі, рабачкому, праўленьня калгасу — канкрэтна, прадметна заняцца гэтай работай. Мабілізаваць начыньне, прадукты, перавозачныя сродкі, забясьпечыць добрае гатаваньне стравы і своячасовую дастаўку — у гэтым задача.

Ёсьць магчымасьці, няма гаспадарчага вока

Работнікі сталоўкі Рудабельскага саўгасу (Глускі раён) ніякай падрыхтоўкі да пасеўнай кампаніі не правялі. Яны нават ня маюць на мэце дастаўку абедаў на поле. Наогул грамадзкае харчаваньне пастаўлена з рук вон дрэнна.

У кухні сталоўкі брудна. Не захоўваюцца правілы санітарыі. Уся падлога заліта і закідана лушпаінні ад бульбы. Каля самага катла, дзе разьліваюць страву, мыецца начыньне. На кішэньліку вісяць брудныя анучы. Памяшканьне кухні прасторнае, ёсьць поўная магчымасьць захоўваць чыстату. Бяда ў тым, што **няма гаспадарчага вока, пануе абязьлічка.**

Кіраўніцтва саўгасу, партыйная ячэйка пагардліва адносяцца да гэтай «дробнай» галіны работы.

Не клапоцяцца работнікі і аб тым, каб абед быў смачны. Гатуецца страва дрэнна і аднастайна. Аб паблюднай сыстэме няма і гутаркі. А магчымасьці пашыць якасьць абедаў ёсьць.

Прадукты сталоўкі раскрадаюцца. Сам загадчык сталоўкі Яківовіч расьцягвае цукар, крупу і мяса. Ад забітага кабана толькі 4-5 кілё мяса трапіла на кухню, а астатняе прысвоіў Яківовіч.

Грамадзкае харчаваньне рабочых — важны цэх саўгаснай вытворчасьці. Узорна наладжанае грамадзкае харчаваньне — яшчэ адна зарука пасьпяховага правядзеньня веснавой сяўбы. Гэта трэба зразумець, як работнікам сталоўкі, так дырэкцыі і грамадзкім арганізацыям саўгасу.

Работніца.

Глядзяць скрозь пальцы...

Дубровенскія арганізацыі, як партыйныя, так і савецкія нічога ня робяць, каб наладзіць, як сьлед, харчаваньне рабочых саўгасаў і калгасьнікаў на палёх у часе сяўбы.

У мінулым годзе ў часе палявых работ былі арганізаваны сталоўкі ў калгасах «Трудавік», «Чырвоная паляна» і інш. У гэтым-жа годзе да іх арганізацыі яшчэ не прыступілі.

Сталоўкі, якія ёсьць у саўгасах Дубровеншчыны, не перабудавалі яшчэ сваёй работы, працуюць пастарыцы. У саўгасе «Станіслаўе» работнікі сталоўкі не пераведзены на зьдзельшчыну. Не разгорнута сярод іх спаборніцтва, у выніку абеды падаюцца марудна і неарганізавана. У сталоўцы брудна. У саўгасе «Арловічы» сталоўка знаходзіцца ў вельмі цесным памяшканьні. Абеды нізкай якасьці. Заўсёды стандартныя.

Ня лепш стаіць справа з грамадзкім харчаваньнем у саўгасах «Халоўе» і «Дзёмкіна». Тут у сталоўках таксама работа не перабудавана, бруд на і тыя-ж стандартныя абеды.

Ніякія крокі ня зроблены як у раёне, так і на мясцох для арганізацыі паходных кухань, для наладжаньня дастаўкі стравы на поле. Стараецца ўражаньне, што ў Дубровеншчыне кіраўнікі райкалгассаюзу і сыстэма спажыўкаапэрацыі глядзяць скрозь пальцы па важнейшую справу.

Слуцкін.

ДАПАМОЖАМ СТАЛОВЫМ, ЖАКТ'ам, ШКОЛАМ І ЗРК У АРГАНІЗАЦЫІ ТРУСАГАДОЎЛІ

На нарадзе пры „Зьвязьдзе"

Далікатэсы сталовай жакту № 6

Сталовая жакту № 6 зьмяшчаецца па Камсамольскай вуліцы. У гэтай сталовай харчуецца 300 рабочых і служачых. У міжнародны пралетарскі дзень — 1 мая сталовая частавала сваіх пасталянных наведвальнікаў смачным спажыўным далікатэсам. Абед быў згатаваны з трусінага мяса.

Такім далікатэсам у сталовай жакту № 6 частуюць ня толькі па вялікіх сьвятах. Зімой часта можна было ў буфэце і на абед атрымаць порцыю труса.

Яшчэ ў верасьні мінулага году ініцыятыўны загадчык сталовай тав. **Люстэрнік** арганізаваў трусятнік. Спачатку ён набыў у саўгасе «Курасоўшчына» 24 трусаматкі і 6 самцоў. Там іх выбракавалі, як хворых катарам. Люстэрнік пачаў іх лячыць. Трусом давалі раствор крэаліну. Большая частка іх ачуняла. Пад трусятнік прыстасавалі старыя хлявы. У канцы кастрычніка злучылі чатырох матак. Тры з іх далі праз месяц 16 штук маладняка. Усе яны перазімавалі. Раньняй вясной зноў пачалі злучку. Акролы пачаліся ў сакавіку. Да ўчарайшага дня было 32 акролы. У трусятніку ўжо ёсьць разам з маладняком 300 трусоў. Да канца году мяркуецца мець каля 2.000 штук.

Зараз для трусятніка ствараецца кармовая база. Сад, які знаходзіцца побач, засяваецца віка-аўсянай мяшанкай, а гарод—кармовымі буракамі і бручкай.

Трусятнік сталовай ЖАКТ'у № 6. Лепшы вытворнік пароды «Шаншыла».

Тав. Люстэрнік — рабочы-вылучэнец, член партыі, раней працаваў на заводзе імя Варашылава.

Даглядае трусоў аматар-трусавод тав. **Бугаёва.** Падзея Алесева. Да 1919 году яна была настаўніцай. У галодныя гады пачала разводзіць трусоў. Мела іх каля 150 штук і гэтым пракормлівала сям'ю.

— Трус — зьвярок без вялікіх запатрабаваньняў, але ўсё-ж такі патрабуе ўважлівага догляду, — кажа тав. Бугаёва. У нас 35 штук хварэюць катарам, але мы іх лечым пяўпроцантным растворам крэаліну, даем рэгулярна па пекалькі кропель. Паступова яны ачуняюць.

Сталовая жакту № 6 пакуль адзіная ў Менску, якая мае трусоў.

Трусабаязьнь

На жаль, ня ўсюды наглядаюцца такія ўважлівыя адносіны да труса.

Тав. **Багушэўскі** — старшыня Трусаводкалгасцэнтру — у сваім выступленьні адзначыў, што ў некаторых раёнах да труса яшчэ адносяцца з пагардаю. Так, у Койтанаўскім раёне ў калгасе **«За ўладу Саветаў»** трусоў выкінулі з трусятніка, занялі яго пад майстэрню. З 200 трусоў засталося 60.

Супрацоўнікі плянавага сэктару Менгарсавету ўжо балцца, каб трусы ня зьнішчылі пасеваў і сумняваюцца у мэтазгоднасьці трусагадоўлі.

У **Лепельскім** раёне сяляне займаюцца трусагадоўляй. Ёсьць шмат старых трусаводаў. Лепельскі райспажыўсаюз і сельспажыўтаварыства загатовілі каля 500 штук трусоў, але «ня ведалі, куды іх дзець» і перадалі ўсіх саміц і самцоў на ўбой. Старшыні сельспажыўтаварыстваў скардзяцца, што ім нікуды дзявацца з трусамі, што спажыўсаюз іх не бярэ.

Праявіць ініцыятыву набываць трусоў у БССР

Намесьнік народнага камісара РСІ тав. **Гетнэр** у сваім дакладзе спыніўся на радзе вузлавых пытаньняў, зьвязаных з разгортваньнем трусагадоўлі. Дагэтуль, — кажа тав. Гетнэр, — усе трусагадоўчыя арганізацыі БССР рабілі стаўку толькі на завоз трусоў з іншых рэспублік. Вось з такім поглядам, што ў БССР неабходна адпеўць завозіць трусоў, трэба пакінуць, бо мы іх з посьпехам можам загатаўляць у нашых-жа раёнах. Лепшым доказам гэтага зьяўляецца тое, што ў мінулым годзе Белпушніна загатовіла 32.000 скурак. Нашы заводзкія, каапэрацыйныя і грамадзкія арганізацыі не павінны чакаць, што ім пехта завязе трусоў. Трэба праявіць уласную ініцыятыву і самім набываць трусоў у межах БССР.

Зараз з пачаткам сяўбы ў прыгарадных і каапэрацыйных гаспадарках трэба ўжо загадзя рыхтаваць кармовую базу для трусятнікаў, якія арганізуюцца.

Падрыхтуем трусаводаў-практыкаў з рабочых і работніц

Ня менш важнае пытаньне — падрыхтоўка кадраў. У мінулым годзе былі арганізаваны курсы па трусагадоўлі, якія скончылі 32 чалавекі, але дзе гэтыя курсанты зараз — ніхто ня ведае.

Сярод нашых прафсаюзных работнікаў, каапэратараў, рабочых ёсьць нямала аматараў-трусаводаў. Вось гэтыя кадры трэба выявіць, павысіць іх кваліфікацыю, і мы будзем мець спэцыялістаў-практыкаў. Для вырашэньня гэтых пытаньняў трэба зьвяць усю грамадзкасьць, камсамол, прафсаюзы, цэнтральны і раённы друк.

На пытаньнях падрыхтоўкі кадраў спынялася большасьць прысутных. Прадстаўнік ЦСПСБ тав. **Фёдараў** пад крэсьліў, што падрыхтоўку кадраў трэба фарсаваць шляхам арганізацыі вячэрніх курсаў, курсаў-канфэрэнцый. Толькі такім чынам мы зможам у найкарацейшы тэрмін падрыхтаваць вузкіх спэцыялістаў-практыкаў з рабочых, работніц, якія вылучаюцца прадпрыемствамі, ЗРК і іншымі арганізацыямі.

Характэрную гісторыю аб тым, як праваго і дагаворнага базісу, што палітыка няпрызнаньня СССР збанкрутавала, што калі амэрыканскі капітал ня хоча страціць вялізарны савецкі рынак, дык ён павінен зрабіць з гэтага **палітычныя** вывады. «Прыйшоў час адносіцца да фактаў са здаровым розумам», —заяўляе між іншым уплывовая паўднёвая газэта «Адвэртайзэр», падкрэсьліваючы скарачэньне амэрыканскага экспарту, рост значэньня савецкага рынку і ўстойлівасьць савецкага ўраду.

«Бясплённасьць захаваньня цяперашняга становішча савецка-амэрыканскіх адносін становіцца з кожным днём усё больш відавочнай», — адзначае амэрыканская часопісь «Чайна Уіклі Рэвью», якая выходзіць у Шанхаі. Напомніўшы, што ў мінулым супроць прызнаньня СССР высоўваліся ў асноўным два довады — царскія даўгі і адсутнасьць пэрспэктыў гандлю з Савецкім саюзам, — гэтая часопісь падкрэсьлівае, што «ў пэрыяд сусьветнага крызісу, калі канчаткова даказана немагчымасьць прымусіць плаціць Германію, таксама ясна, наколькі безнадзейна ўсякая спроба прымусіць савецкі ўрад прызнаць старыя даўгі». І яшчэ больш бязглузьдзіцай гучыць кінутая калісьці Юзам крылатая фраза «Расія зьяўляецца вялізарнай эканамічнай пустатой».

Газэты ўплывовага трэсту «Скрыпс Говард» вядуць арганізаваную кампанію з патрабаваньнем пасьлядоўнага ў СССР дзелавой дэлегацыі і ўстанаўленьня нармальных зносін. Да гэтай кампаніі далучыліся ў апошнія дні рад адказных палітыкаў Злучаных Штатаў. «Няпрызнаньне СССР зьяўляецца эканамічным злачынствам», — заявіў Рэйні — лідэр пануючай дэмакратычнай фракцыі палаты прадстаўнікоў. Аналягічную заяву зрабіў 22 красавіка сэнатар Джозэф Робінсон, лідэр дэмакратычнай фракцыі сэнату. Ёсьць шмат сведчаньняў аб тым, як у віцэ-прэзыдэнты на папярэдніх выбарах. «Я лічу, — заявіў Робінсон, — што ўстанаўленьне дыпляматычных і гандлёвых адносін з СССР павінна быць хутка абмеркавана; яно адлюструе сабой палітыку, якая задзейнічае прыяцельскім міжнародным адносінам і стымулюе замежны гандаль ПАЗШ».

Сэнатар Бора, стары прыхільнік прызнаньня СССР, адгукнуўся на гэту заяву пастуцным чынам: «Яна (заява) мае выключнае значэньне ня толькі з прычыны становішча сэнатара Робінсона, але і таму, што ён зрабіў яе ў момант, калі было неабходна выказацца з поваду гэтага, у абстаноўцы, якая прыдае пытаньню аб прызнаньні СССР, крайнюю важнасьць». Выступленьне Робінсона знайшло адпаведныя водгукі і з боку раду іншых сэнатараў, як дэмакратаў, так і рэспубліканцаў. Паводле сьцьвярджэньня сэнатара Уілера, у сэнаце ўжо больш або менш забясьпечана большасьць для прыняцьця рэзалюцыі аб устанаўленьні нармальных адносін з Савецкім саюзам.

Само сабой зразумела, што цытаваныя вышэй заявы не даюць поўнай карціны тэй барацьбы, якая працягваецца і абвастраецца ў Злучаных Штатах вакол «расійскага пытаньня», але яны з выстарчальнай выразнасьцю характарызуюць пазіцыі пэўных зрухаў. Чым-жа выклікаюцца гэтыя апошнія?

Частковы адказ на гэта пытаньне дае крызіс. Разьвіцьцё крызісу, скарачэньне амэрыканскага экспарту напалову, пястрыманы рост беспрацоўя, масавыя банкрутцтвы, бязупынная агульная пагоршаньне эканамічнай кан'юнктуры — усё гэта ня можа не прыцягнуць увагі да катастрафічнага скарачэньня амэрыканскага гандлю з адзінай краінай сьвету, якая ня ведае крызісу. Той факт, што гэта скарачэньне адбылося пры **адначасовым абсалютным росьце гандлю СССР з некаторымі іншымі краінамі** адбылося выключна ў сілу захаваньня і пагоршаньня палітычных



Трусятнік сталовай ЖАКТ'у № 6. Простапародная трусаматка пасьля злучкі з пародай «Шаншыла» прынесла 5 палепшаных трусоў.

Загадчык сталовай ЖАКТ'у № 6 тав. ЛЮСТЭРНІК.

прадстаўнікі Белпушніны ўсё яшчэ працягваюць палітыку загатоўкі скурак, а ня жывых трусоў.

* * *

Нарада паказала, што трус пачынае запаёўваць права грамадзянства, да труса прыкавана ўвага. Мы маем усе магчымасьці для хуткага разгортваньня трусагадоўлі. Неабходна, каб цэнтральныя плянуючая і кіруючыя арганізацыі дапамаглі заводам, фабрыкам, школам у набыцьці матачнага стада, падрыхтоўцы кадраў і адпаведнай кансультацыяй.

Саболін.

Аб фактах адбіраньня асобных магазынаў і крам спажыўкаапэрацыі

Пастанова ЦК КП(б)Б

1. Адзначыць, што ня гледзячы на пастанову ЦК аб максымальным разгортваньні гандлёвай сеткі спажыўкаапэрацыі, рад раёнаў (Магілеўскі, Аршанскі, Полацкі і Барысаўскі) сваімі пастановамі аб высяленьні органаў спажыўкаапэрацыі з займаных імі гандлёвых памяшканьняў сказілі недапушчальна груба пастановы ЦК партыі.

2. ЦК паказвае Магілеўскаму, Аршанскаму, Полацкаму і Барысаўскаму райкомам на недапушчальнасьць падобных рашэньняў і абавязвае гэтыя РК скасаваць свае пастановы аб высяленьні з памяшканьняў гандлёвых адзінак спажыўкаапэрацыі, забясьпечыўшы поўнае выкананьне пляну разгортваньня гандлёвай сеткі.

3. ЦК абавязвае ГК і РК, гарсаветы і РВК у далейшым не дапускаць падобных пастаноў і прапануе прыняць усе меры да выкананьня пляну разгортваньня гандлёвай сеткі.

СТВАРЫЦЬ УСЕ ЎМОВЫ ДЛЯ ЛЯГЕРНАЙ ВУЧОБЫ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Чырвоная армія канчае зімовы пэрыяд навучаньня і неўзабаве пройдзе на летнія формы баявой падрыхтоўкі. Набліжаецца выхад часьцей у лягеры — момант, які вызначае пачатак летняй вучобы.

Выхад у лягеры азначае сабой новую і яшчэ больш складаную ступень у навучаньні войск. **Лягерныя зборы — адзін з самых адказных этапаў баявой і палітычнай падрыхтоўкі часьцей РСЧА.** У лягерны пэрыяд войскі павінны завяршыць сваю баявую вучобу і ня проста завяршыць, але і — што асабліва важна — давесьці да канца поўнае і пасьпяховае вырашэньне ўсіх задач, якія пастаўлены перад імі на бягучы навучальны год.

Лягерныя зборы гэтага году будуць праходзіць ва ўмовах выключнай напружанасьці. Патрабаваньні ў галіне баявой і палітычнай вучобы за апошні год значна **ўзрасьлі.** Аснашчэньне армії новай тэхнікай, ускладненьне форм боя, вялізарны культурна-палітычны рост мас — усё гэта прад'яўляе да ўсіх армейскіх арганізацый непамерна больш высокія патрабаваньні, чым раней. Абвастрэньне небясьпекі ваеннага нападу на СССР ставіць рэзка, як ніколі, пытаньне аб пастаяннай і поўнай баявой гатоўнасьці Чырвонай армії, аб яшчэ большым павышэньні тэмпаў і якасьці вучобы.

Адказьнейшыя і складаныя задачы летняга навучаньня ў бягучым годзе, натуральна, патрабуюць ад начскладу і чырвонаармейцаў, ад войск у цэлым выключнага напружаньня высокіх тэмпаў і вялікіх намаганьняў у навучальнай рабоце.

Пасьпяховасьць разгортваньня летняй вучобы будзе залежыць у простай ступені ад таго, наколькі своячасова і поўна **падрыхтуюцца** часьці да лягерных зборaў. Толькі своячасовая і ўсебаковая падрыхтоўка забясьпечыць неадкладнае пераключэньне часьцей па летнюю падрыхтоўку і дазволіць удасканалена прапрацаваць вялікую і вельмі складаную баявую праграму.

Вось чаму падрыхтоўка да выхаду ў лягеры набывае выключнае значэньне і патрабуе ад войск і ўсёй савецкай грамадзкасьці добра прадуманага пляну палітычнага і гаспадарчага абслугоўваньня войск у лягерах, актыўнага ўдзелу і дапамогі.

Войскам неабходна, улічваючы адказныя задачы і параўнальна невялікі бюджэт часу летняга навучаньня, загадзя ўдакладніць арганізацыйны бок летняга навучаньня, распрацаваць пляны, праграмы і расьпісаньні баявой і палітычнай вучобы, падрыхтаваць увесь апарат часьцей — штабы, камандзіраў, палітработнікаў, а таксама партарганізацыі, камсамол — з такім разьлікам, каб **з першага дня** ўключыць чырвонаармейца ў баявыя тэмпы вучобы, каб з першага дня разгарнуць плянамерную, арганізаваную, сыстэматычную і ўпартую барацьбу за аўладаньне вышынямі баявой вучобы.

У адносінах саміх лягераў, падрыхтоўчая работа ў першую чаргу павінна быць накіравана на забесьпячэньне своячасовага рамонту і абсталяваньня лягерных пабудоў, стралковых ціраў, папыраньне і даабсталяваньне стрэльбішчаў і правядзеньне раду мерапрыемстваў па гаспадарчым абслугоўваньні лягераў.

Забесьпячэньне стрэльбішчамі, абсталяваньнямі ў адпаведнасьці з новымі патрабаваньнямі, павінна зьвязіцца адказьнейшай задачай камандаваньня кожнай часьці, бо ў вырашэньне гэтага пытаньня ўпіраецца пасьпяховасьць усёй стралковай падрыхтоўкі. Разам са стрэльбішчамі неабходна загадзя паклапаціцца аб выяўленьні вучэбных палёў, узгадніць пытаньне аб прадастаўленьні іх вайсковым часьцям. Нарэшце, усе часьці павінны паклапаціцца аб падрыхтоўцы і рамонце прадметаў лягернай маемасьці.

Уся гэта рознастайная і складаная работа па забесьпячэньні нармальных умоў лягернай вучобы можа быць з посьпехам выканана вайсковымі часьцямі толькі пры актыўным удзеле і дапамозе ўсіх партыйных, камсамольскіх, савецкіх, прафсаюзных і гаспадарчых арганізацый БССР. Неабходна практычная садзейнасьць усіх грамадзянскіх арганізацый у справе **лепшага матар'яльнага забесьпячэньня лягераў і стварэньня ўмоў лепшай баявой падрыхтоўкі.**

Па лініі прафсаюзаў неабходна **ўмацаваць шэфства над вайсковымі часьцямі,** як важнейшую форму пралетарскага ўплыву на армію, узмацніць штодзённую сувязь з лягерамі.

Асабліва вялікую ролю павінна адыграць каапэрацыя, органы Наркамснабу і іншыя арганізацыі, забясьпечыўшы поўнае і бесьперабойнае снабжэньне лягераў, арганізацыю **грамадзкага харчаваньня** начскладу і іх сем'яў, паляпшэньне харчаваньня дзяцей у дзіцячых садох і калёніях.

Павінна быць аказана актыўная дапамога па лініі органаў Наркамасьветы, гарсаветаў і райвыканкомаў у арганізацыі **дзіцячых пляцовак у лягерах і ў гарадзе,** а таксама ў арганізацыі **дзіцячых калёній** для дзяцей начскладу.

Органы аховы здароўя неабходна абавязаць арганізаваць **начныя санаторыі для адпачынку начальніцкага складу** ў месцы знаходжаньня лягераў, з добра пастаўленым харчаваньнем і ўсімі ўмовамі для вячэрняга адпачынку.

Важнейшае значэньне набываюць **пытаньні культурнага абслугоўваньня часьцей,** арганізацыя масавых мастацкіх вечароў, дапамога ў абсталяваньні кіно-ўстановак, забясьпячэньня іх добраякаснымі карціпамі, радыёфікацыя лягераў, **узмацненьне ўсіх тэхнічных сродкаў палітработы.**

Чым лепш будзе забясьпечана летняя вучоба, тым з большым посьпехам яна будзе завершана, тым вышэй будзе ўзьвівацца сьцяг Чырвонай арміі, — аплоту міру, — тым больш грозным ён будзе для нашых ворагаў.

ЗЛОБІН.

Н. Цярэнцьцеў

Казкі аб „эканамічнай пустаце" разьвейваюцца

Апошнія тыдні азнаменаваліся ў Злучаных Штатах некалькімі фактамі і многімі выказваньнямі аўтарытэтных палітычных дзеячоў, якія сьведчаць аб тым, што ўсё больш шырокія колы амэрыканскай буржуазіі пачынаюць уяўляць сабе бязглузьдзіцу і шкоднасьць стравусавай палітыкі амэрыканскага ўраду ў адносінах да СССР.

Яшчэ нядаўна — які-небудзь год таму назад — тон дыскусіі па пытаньні аб адносінах да СССР акрасьліваўся ў асноўным крыклівым фіглярствам члена палаты прадстаўнікоў Фішэ, аўтара вядомых фальшывак Уолена і іншых паёмных прадстаўнікоў марганцавых, запалкавых і дрэваапрацоўчых бароваў. Апошнія, кіруючыся сваімі своякарысьлівымі інтарэсамі, арганізавалі шалёную кампанію супроць савецкага экспарту. У той пэрыяд антысавецкія элемэнты, якія хоць і прадстаўлялі на сучасьці пязначную меншасьць у лягеры амэрыканскай буржуазіі, вялі **наступленьне:** яны дамагаліся правядзеньня розных абмежавальных і забаронных мер, накіраваных супроць савецкіх тавараў; яны патрабавалі поўнай забароны гэтых тавараў, яны ва ўсякім выпадку дабіліся такога пагоршаньня прававых і кредытных умоў савецка-амэрыканскага гандлю, якое не магло ня прывесьці да рэзкага скарачэньня савецкіх заказаў у ПАЗШ.

Зразумела, кампанія ілжы і паклёпу супроць СССР ня спынілася ў ПАЗШ. У сілу раду прычын можна нават меркаваць, што фонды, якія адпускаюцца зацікаўленымі коламі на арганізацыю гэтай кампаніі будуць у бліжэйшы час павялічаны і што натхнёныя новымі заахвочваньнямі прысяжныя саветафобы накупталт Фішэ будуць крычаць яшчэ больш гістэрычна, чым раней. І тым ня менш атмасфэра яўна зьмянілася.

Кампанія разьвівалася ў абстаноўцы раўнадушша шырокіх колаў буржуазіі, выклікаючы пратэсты толькі з боку тых дзелавых колаў, якія адчувалі яе вынікі на ўласнай кішэні,—зараз гэта раўнадушша зьнікла. Рад цэнтральных і правінцыяльных органаў амэрыканскага друку, у тым ліку такіх, якія былі раней зусім абыякавы ў адносінах да «расійскага пытаньня», прада стаўляючы Фішэм рабіць іх брудную справу — зараз выказваюць рашучае абурэньне глупай палітыкай зруйнаваньня гандлю Амэрыкі з СССР. «Мы сьвядома зьнішчаем гандаль і парушаем адносіны з адной з буйнейшых краін сьвету, прычым робім гэта ў шкоду сваім уласным інтарэсам», — заяўляе рэспубліканскі сэнатар Норыс. — «Урад Злучаных Штатаў дазваляе антысавецкім прапагандыстам пазбаўляць краіну буйнейшага сусьветнага рынку, які будзе існаваць на працягу бліжэйшых 25 год»,—указвае Генры Рэйні, лідэр дэмакратычнай партыі. — Наша шалёная палітыка дае магчымасьць Германіі захапіць савецкі рынак.

Падобныя заявы робяцца зараз штодзённа дзесяткамі. Н'ю-ёрская «Асацыяцыя камэрсантаў» вынесла ўжо ад паведную рэзалюцыю. Мытны суд ПАЗШ, які не застаецца, зразумела, неадчувальным да палітычных уплываў, яшчэ 10 сакавіка вынес рашэньне супроць прыняцьця ў 1930 г. пастановы міністэрства фінансаў аб увядзеньні спэцыяльных «антыдэмпінгавых» мыт на ўвоз савецкіх запалак. Праект увядзеньня спэцыяльнага штрафнога падатку ў 100 проц. цаны на ўсе савецкія імпартныя тавары, быў 26 сакавіка адхілен амэрыканскай палатай прадстаўнікоў, вялізарнай большасьцю галасоў (91 супроць 27).

Але амэрыканская буржуазія пачынае разам з тым уяўляць сабе, што



прававых і кредытных умоў амэрыканска-савецкага гандлю, павінен быў рана ці позна прымусіць амэрыканскія дзелавыя колы забіць трывогу. Гэта трывога тым больш зразумела, што з кожным днём прадпасылкі палітыкі няпрызнаньня, прадстаўленьне Савецкага саюзу, як «эканамічнай пустаты» — становяцца ўсё ў большай ступені — насьмешкай, або брэдам вар'ята. Добра і казка аб «савецкім вакууме», аб «пустаце» — у краіне, якая ня ведае беспрацоўя, якая гігантскімі тэмпамі будуе сацыялізм, на справе ажыцьцяўляе лёзунг «дагнаць і перагнаць», атрымлівае адну за другой вялізарныя, нябывалыя перамогі на фоне гніньня ўсяго капіталістычнага сьвету, у краіне, дзе ўдзельная вага яе ў сельскай гаспадарцы расьце літаральна не па днях, а па гадзінах.

Усе гэтыя моманты забясьпечваюць зразумела паступовае «прозрэнне» амэрыканскай буржуазіі ў «расійскім пытаньні». Яно вельмі аблягчаецца ў апошні час у сувязі з тым ударам, які нанесен Амэрыцы на Далёкім Усходзе. І невыпадкова кампанія ў карысьць прызнаньня СССР супадае па часу з далейшым абвастраньнем сітуацыі на Далёкім Усходзе і ў Цідзім акіяне, створанай вайной і інтэрвэнцыяй японскага імпэрыялізму. Нам ужо ня раз прыходзілася ўказваць, што гэтыя вайна і інтэрвэнцыя, непасрэдным аб'ектам якіх зьяўляецца Кітай, накіраваны з усёй выраснасьцю супроць ПАЗШ і зьяўляюцца пасьлядоўнымі актамі японскага наступленьня ў барацьбе з Амэрыкай за панаваньне над Ціхім акіянам. Нам прыходзілася таксама ўказваць, што амэрыканскі імпэрыялізм зусім непрымірымы ў адносінах да японскіх дамаганьняў і да японскіх заваяваньняў, бо захват Манчжурыі, захват Шанхаю разгром прынцыпу «адчыненых дзьвярэй» і пэрспэктыва падзелу Кітаю паміж імпэрыялістамі, з захопам львінай яго долі Японіяй, знамянуюць карэнную зьмену на не карысьць Амэрыцы—умоў далейшай барацьбы і значыць сур'ёзнае паражэньне ПАЗШ. Пасьпяховае далейшае ажыцьцяўленьне цяперашняй японскай праграмы знамянавала-б поўную **катастрофу** для ўсёй далёка-усходняй палітыкі ПАЗШ.

Але ПАЗШ ня могуць не разумець, што палітыка няпрызнаньня СССР (з якім, да рэчы кажучы, Амэрыка нідзе непасрэдна **не сутыкаецца**) зьявілася і застаецца буйнейшым фактарам, які спрыяе разьвіцьцю японскай інтэрвэнцыі. Бо сама гэта інтэрвэнцыя была магчыма толькі ў абстаноўцы антысавецкіх інтрыг і плянаў інтэрвэнцыі, якія абапіраліся ў прыватнасьці на адсутнасьць нармальных адносін паміж СССР і ПАЗШ, бо пэрспэктыва перарастаньня японскай інтэрвэнцыі на Далёкім Усходзе ў інтэрвэнцыю супроць СССР зьяўляецца важнейшым момантам, які забясьпечвае «благосклонность» да Японіі эўра пэйскіх дзяржаў.

У сучасны момант ПАЗШ аказаліся ізаляванымі, што і прымушае іх займаць да пары, да часу вычакальную стрыманую пазыцыю. Японія спірацца ў сваёй наступальнай палітыцы на просты дагавор з Францыяй і пэўную дагаворанасьць з Англіяй, канкрэтна—**на падтрыманьне французкай і ангельскай рэакцыі, якая ўвязвае гэта падтрыманьне са сваімі ўласнымі антысавецкімі плянамі.** Адсутнасьць адносін з СССР даваршае гэту ізаляцыю Амэрыкі, якую Стымсон дарэмна прабуе прарваць у Жэнэве. Амэрыканская буржуазія пажынае цяпер плады сваёй уласнай неразумнасьці і сьлепаты.

Што гэты момант адыгрывае пэрпаступовую, рашаючую ролю ў якасьці фактара, які выклікае зрух у пазыцыі амэрыканскай буржуазіі ў адносінах да СССР—не падлягае ніякаму сумненьню. Газэты трэсту Скрыпс-Говард падкрэсьліваюць, што падзеі на Далёкім Усходзе нагнятаюць небясьпеку ваеннага нападу на СССР і рызыку новай сусьветнай вайны, адказнасьць за якую кладзецца і на ПАЗШ, паколькі яны працягваюць байкатаваць СССР. Рэспубліканскі сэнатар Джансон, выступаючы за ўстанаўленьне нармальных адносін з Савецкім саюзам, указвае, што яно неабходна ў сувязі са становішчам на Далёкім Усходзе. Пацыфіст Лібі знаходзіць, што няпрызнаньне СССР з боку ўраду ПАЗШ натхняе Японію і што зьмена гэтай палітыкі «зьвяліца, бадай, самым вялікім укладам Амэрыкі ў справу ўстанаўленьня стабільнасьці ва ўсім сьвеце».

Сітуацыя, як яна складаецца ў сучасны момант на Далёкім Усходзе, — піша ўжо цытаваная вышэй шанхайская часопісь «Чайна Уіклі Рэвью» — нямінуча павінна прывесьці да такіх цесных адносін паміж Амэрыкай і СССР, якіх яшчэ не існавала з часу ўстанаўленьня савецкай улады. Часопісь спасылаецца пры гэтым на «паралелізм» лініі дзеяньня ПАЗШ і СССР на Далёкім Усходзе.

Падзеі на Далёкім Усходзе мелі такім чынам сваім простым вынікам прыцягненьне ўвагі самых шырокіх колаў амэрыканскай буржуазіі да праблемы ўзаемаадносін ПАЗШ з СССР. Зразумела, антысавецкія адносіны, цесна зьвязаныя з адпаведнымі коламі ўсёй сусьветнай рэакцыі, разам з імі працуюць над уцягненьнем Японіі ў антысавецкую авантуру ў разьліку на ператварэньне далёка ўсходняй інтэрвэнцыі ў гігантскую сусьветную вайну супроць Савецкага саюзу, у разьліку на выхад з крызісу шляхам гэтай вайны, шляхам аграбленьня працоўных савецкай краіны і падпарадкаваньня іх ярму капіталістычнай эксплёатацыі. Мяркуючы, аднак, на водгуках, якія даносяцца да нас з Амэрыкі, уплывовыя элемэнты амэрыканскай буржуазіі ўяўляюць сабе гібельнасьць гэтай авантуры, таксама як і нявыгаду для ПАЗШ такіх спроб вырашэньня далёка-усходняга пытаньня, посьпех якіх азначаў-бы вялізарнае ўзмацненьне імэрыялістычных праціўнікаў Амэрыкі.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

Змаганьне за якасьць прадукцыі—неадлучная частка барацьбы за прамфінплян

З выступленьня сакратара ЦК КП(б)Б тав. РЫСКІНА на ўсебеларускай канфэрэнцыі ўдарнікаў якасьці харчовай прамысловасьці

дазвольце мне ад імя Цэнтральнага Камітэту партыі перадаць вам, ударнікам якасьці харчовай прамысловасьці, бальшавіцкае прывітаньне (воплескі).

Барацьба за якасьць прадукцыі зьяўляецца важнейшай, неадлучнай часткай барацьбы за прамфінплян. Яна зьяўляецца адным з важнейшых мерапрыемстваў у змаганьні за павялічэньне матар'яльных рэсурсаў пралетарскай дыяржавы, за паляпшэньне матар'яльна-бытавых умоў рабочай клясы. Вось чаму канфэрэнцыя па якасьці мае вялізарнае палітычна-гаспадарчае значэньне. Яна павінна даць рашучы зрух у бок паляпшэньня якасьці нашай прадукцыі.

Рабочая кляса, пад кіраўніцтвам партыі, у выніку ўпартай барацьбы за бальшавіцкія тэмпы, у выніку правільнага і няўхільнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі, дабілася раду рашаючых посьпехаў у сацыялістычным будаўніцтве. Гэтыя посьпехі дасягнуты ня толькі ў галіне росту цяжкай індустрыі, але і ў справе разгортваньня лёгкай і харчовай прамысловасьці.

Аднак, побач з гэтымі агульнымі посьпехамі, якія мы маем, у радзе месц, з прычыны дрэннай работы многіх гаспадарчых, прафсаюзных і мясцовых партыйных арганізацый, з прычыны невыстарчальнай перабудовы працы ў адпаведнасьці з указаньнямі правадыра партыі тав. Сталіна, дапушчаны прарывы ў выкананьні прамфінпляну як 1931 году, так і першага кварталу г. г., прычым гэтыя прарывы маюць месца ня толькі ў галіне выкананьня колькасных паказальнікаў, але галоўным чынам у галіне якасных паказальнікаў.

У 1931 годзе прамысловасьць ВСНГ выканала гадавы плян на 68 проц. Прамысловасьць Наркамснабу выканала вытворчую праграму на 75 проц. г. зн. недадала краіне валавой прадукцыі ў разьмеры 25 проц. пляну. На радзе галін прамысловасьці лічбы яшчэ больш зьніжаюцца: па запалкавай—63 проц. выкананьня гадавой праграмы, па шкляной—56 проц., па папяровай—56 проц. Плян зьніжэньня сабекошту вызначаны ў разьмеры 8 проц., а выкананы ня больш, чым на 1,7 проц. Па некаторых галінах мы маем нават павышэньне сабекошту: па шкляной—на 14 проц., па запалкавай—на 4,8 проц., па тэкстыльнай—на 3,8 проц.

Першы квартал 1932 году ня даў асаблівага пералому ў выкананьні якасных і колькасных паказальнікаў. Аб гэтым сьведчыць тое, што лёгкая прамысловасьць выкапала плян на 88 проц., а прамысловасьць Наркамснабу—на 89 проц. Між тым, першы квартал бягучага году павінен быў пакласьці аснову для посьпяховага ажыцьцяўленьня праграмы 1932 году ў цэлым.

Калі вы возьмеце паасобныя галіны прамысловасьці, дык убачыце, як ганебна мы адстаем. Для прыкладу адзначым работу маслапраму, які выканаў заданьне па загатоўцы і пераапрацоўцы малочных прадуктаў ня больш чым па 5 проц. Гэтая ганебная лічба — вынік апартуністычных адносін да справы, стаўкі на самацёк, адсутнасьці бальшавіцкай барацьбы за важнейшую галіну рабочага снабжэньня.

Яшчэ горш стаіць справа з ажыцьцяўленьнем **якасных паказальнікаў** як па лініі лёгкай прамысловасьці, так і па прамысловасьці Наркамснабу. Прадпрыемствы лёгкай прамысловасьці ў студзені павысілі сабекошт на 2 проц., у лютым—на 3 проц. Ня лепшыя вынікі і па харчовай прамысловасьці.

Ні ў якім разе нельга лічыць нармальным такое становішча. Гэтыя паказальнікі тым больш недапушчальны, паколькі гутарка ідзе аб апошнім годзе першай пяцігодкі, які павінен стварыць адпаведныя ўмовы і прадпасылкі для посьпяховага ажыцьцяўленьня плянаў другой пяцігодкі.

XVII усесаюзная партканфэрэнцыя паставіла перад намі задачу — падвоіць, патроіць душавое спажываньне працоўных у другой пяцігодцы. Гэту задачу мы павінны выканаць ва што-б там ні стала. Гэта значыць, што нам трэба ў 2-3 разы павялічыць выпуск прадукцыі, у тым ліку па лёгкай і харчовай прамысловасьці.

Каб ажыцьцявіць задачы, што стаяць перад намі, каб стварыць умовы для посьпяховага выкананьня плянаў другой пяцігодкі, патрэбны перш за ўсё бальшавіцкія тэмпы ў рабоце па выкананьні ўсіх паказальнікаў прамфінпляну.

Тав. Сталін на XVI зьезьдзе ўсеКП(б) з асаблівай сілай завастрыў пытаньне аб якасьці нашай прадукцыі. У сваім дакладзе ён падкрэсьліў, што «нельга далей цярпець хібаў у галіне рацыяналізацыі, невыкананьне пляну па зьніжэньні сабекошту і агідную якасьць прадукцыі раду нашых прадпрыемстваў. Гэтыя хібы і недахопы ціснуць на ўсю нашу народную гаспадарку і не даюць ёй рушыцца наперад. Пара, даўно пара пакончыць з гэтай ганебнай плямай». Гэта ганебная пляма зьяўляецца зусім нецярпімай з пункту гледжаньня задач сацыялістычнага будаўніцтва, задач паляпшэньня матар'яльнага становішча рабочай клясы.

На самай справе, якое ў нас зараз становішча з прадметамі шырокага спажываньня? Ня гледзячы на значны рост вырабу прадметаў шырокага спажываньня ў параўнаньні з даваенным часам, усё-ж мы ня можам задаволіць у поўнай меры ўзросшых запатрабаваньняў шырокіх мас.

Тав. Арджанікідзэ на XVII партканфэрэнцыі прывёў наступныя даныя аб вырабе прадметаў шырокага спажываньня ў 1931 годзе ў параўнаньні з 1913 годам.

У 1913 годзе па ўсёй Расіі вырублена галёш 27 млн. пар, у 1931 годзе выпушчана 53,9 млн. пар, г. зн. амаль у два разы больш, чым да вайны і ў 2,25 раза больш, чым у 1925 годзе. Абутку было выраблена ў 1913 годзе 8.400 тыс. пар, у 1925 годзе—8 млн. пар, а ў 1931 годзе—76.800 тыс. пар, г. зн. у 9 раз больш, чым да вайны і ў 9,5 раза больш, чым у 1925 годзе. Калі нават улічыць, што ў 1913 г. было выраблена саматужнікамі яшчэ 8,5 млн. пар, дык і тады атрымаецца вялікая розьніца, але ўсё-ж нам сёньня 76,8 млн. пар не хапае для задаваленьня патраб шырокіх мас.

Мыла гаспадарчага ў 1913 годзе было выраблена 94.000 тон, у 1925 годзе—80.000 тон, у 1931 годзе — 182.000 тон, амаль у два разы больш, чым у даваенны час. Пражы бавоўняна-папяровай у 1913 годзе было выраблена 270.000 тон, у 1925 годзе — 208.000 тон, у 1931 гдозе — 306.000 тон.

Як бачыце, мы маем вялізарны рост вырабу прадметаў шырокага спажываньня, аднак, ён адстае ад гіганцкага росту запатрабаваньняў працоўных.

Тут трэба падкрэсьліць, што адным з момантаў, які паглыбляе труднасьці са спажэньнем, зьяўляецца дрэнная якасьць прадукцыі. Спынімся на прадукцыі, якая выпускаецца швэйнай і абутковай прамысловасьцю. Возьмем такі прыклад: у які-небудзь раён на працягу 1-2 кварталаў завезена партыя штапоў, або абутку, якое хопіць прыблізна на год; калі гэта прадукцыя будзе дрэннай якасьці, яна зможа задаволіць запатрабаваньні максымум на 6 месяцаў, бо тэрмін носкі скарачаецца. Вось чаму зусім нецярпімы тыя апартуністычныя адносіны да якасьці прадукцыі, якія наглядаюцца ў радзе месц.

Самая рашучая бальшавіцкая барацьба павінна быць разгорнута на гэтым вучастку. Ударнікі па якасьці павінны быць на перадавых пазыцыях гэтай барацьбы. Трэба памятаць, што дрэнная якасьць прадукцыі пагоршвае тое напружанае становішча з прамтаварнымі фондамі, якое мы зараз маем, б'е па бюджэце рабочага.

Нельга сказаць, што якасьць харчовай прамысловасьці на вышыні. Ёсьць рад фактаў, якія характарызуюць нездавальняючую якасьць харчовых прадуктаў. Напрыклад, на магілеўскай алейні з-за дрэнных, нядбайных адносін да работы у кожным вагоне макухі застаецца 15-20 пудоў алею. На гэтым-жа заводзе з-за нездавальняючай пастаноўкі адстою, алей выходзіць мутным, з вялікім процантам асадку. З-за дрэннай прасушкі ільнасемя, процант алею значна зьніжаецца.

На магілеўскай кандытэрскай фабрыцы цукар хаваўся пад павецьцю, не захаваным ад дажджу і сьнегу, псаваўся, што адмоўна адбівалася на якасьці прадукцыі. На фабрыцы «Камунарка» даведаліся аб тым, што цукар пасаваны толькі тады, калі сіроп патыхаў непрыемным пахам.

Па мясной прамысловасьці, не гаворачы ўжо аб агідным антысанітарным становішчы прадпрыемстваў, ёсьць факты, калі брак пры здымцы сьвіных скур даходзіць да 50 проц., галоўным чынам з-за нядбайных адносін да работы.

Як кваліфікаваць такія адносіны да працы? Гэта—вялікае злачынства перад партыяй і рабочай клясай.

У той час, калі партыя напружвае ўсе свае сілы, згуртоўвае ўвагу рабочай клясы, усёй пралетарскай грамадзкасьці па рашучую барацьбу за максымальную мабілізацыю ўсіх унутраных рэсурсаў, за эканомнае расходаваньне нашых фондаў, на барацьбу з тымі, хто разбазарвае фонды, хто ашуквае рабочага спажыўца, калі партыя аддае выключную ўвагу паляпшэньню рабочага снабжэньня, — у гэтых умовах мы маем факты згубленьня соцень пудоў масла, псаваньня значнай колькасьці цукру, выпуску нядобраякасных кандытэрскіх вырабаў, скарачэньня выпуску добраякаснага сырцу для гарбарна-абутковай прамысловасьці і г. д.

Са злачынныміі адносінамі да работы мы павінны весьці самае жорсткае змаганьне.

Вось, таварышы, чаму мы з усёй сілай павінны завастрыць пытаньне аб якасьці прадукцыі, бо яно непасрэдна зьвязана са справай выкананьня прамфінпляну, павялічэньня рэсурсаў пралетарскай дыяржавы, паляпшэньня матар'яльнага становішча рабочых мас.

Мы маем рад посьпехаў у разгортваньні сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Аднак, гэтыя посьпехі дасягнуты галоўным чынам у галіне выкананьня колькасных паказальнікаў. Трэба дабіцца, каб сацспаборніцтва і ўдарніцтва разгортвалася вакол выкананьня ня толькі колькасных, але і якасных паказальнікаў—зьніжэньня сабекошту прадукцыі, паляпшэньня яе якасьці. **Сапраўдным ударнікам зьяўляецца той, хто дае добрыя паказальнікі як па колькасьці, так і па якасьці.** Якая цана таму ўдарніку, які замест прадугледжаных нормай 4-х пар штапоў вырабляе 5, калі якасьць усіх пяці нікуды нявартая? Такі рабочы толькі псуе матар'ял. Змест павялічэньня прадукцыі, мы маем паніжэньне яе. Трэба абавязкова злучыць барацьбу за колькасьць з барацьбой за добрую якасьць. Толькі той, хто гэта робіць, зьяўляецца сапраўдным ударнікам.

Вакол гэтага пытаньня павінна быць мабілізавана ўвага рабочых мас і інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу. Канфэрэнцыя павінна па-бальшавіцку мабілізаваць рабочых на рашучае змаганьне за высокаякасную харчовую прадукцыю.

УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД ІТС

УЗЬНЯЦЬ МАРКСЫЦКА-ЛЕНІНСКАЕ ВЫХАВАНЬНЕ МАС СПЭЦЫЯЛІСТАЎ

На ранішнім пасяджэньні 8 мая са справаздачным дакладам аб рабоце ўсеМБІТ выступіў член прэзыдыуму ўсеМБІТ тав. **Емяльянаў.**

* Зьезд ІТР БССР — зьезд камандзіраў вытворчасьці — сабраўся ў час пасьпяховага завяршэньня першай пяцігодкі за чатыры гады і канкрэтнай распрацоўкі плянаў другой пяцігодкі. Гэта ставіць перад зьездам

т. ДУБОЎ — загадчык плянава-вытворчага аддзелу Гомельскага заводу «Пралетары». Былы рабочы-сьлесар. Пераведзены за рад рацыяналізатарскіх прапаноў.

падзвычай важныя і адказныя задачы.

* Апошні пэрыяд — пэрыяд вялізарных посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва — характарызуецца рашучым паваротам пераважнай большасьці спэцыялістаў тварам да задач, высунутых партыяй і ўладай, вялікімі палітычнымі зрухамі ў радох інжынэрна-тэхнічных работнікаў. Гэтыя зрухі набылі асабліва шырокія формы пасьля выступленьня тав. Сталіна, у якім ён завастрыў увагу партыі і рабочай клясы па пытаньні зьмяненьня адносін да інжынэрна-тэхнічнай інтэлігенцыі.

* ІТР сталі на чале паходу за заваяваньне тэхнічна-эканамічнай незалежнасьці СССР. Вось некалькі лічбаў. На заводзе «Красный путиловец» у 1931 годзе было сабрана 3.877 прапаноў, правядзеньне якіх у жыцьцё скарацілa імпартныя заяўкі на суму каля 2 мільёнаў рублёў.

* З году ў год павялічваецца процант ахопу ІТР сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам. Так, на 1 лістапада 1930 году было ахоплена сацспаборніцтвам 48,2 проц., на 1 студзеня 1931 году — 55,5 проц., а на 1 студзеня 1932 г. — 64,5 проц. усіх спэцыялістаў СССР. Гэтыя лічбы выразна сьведчаць аб тым, што сацспаборніцтва і ўдарніцтва становяцца асноўнымі мэтадамі ў рабоце ІТР, што савецкія спэцыялісты пага ў нагу з рабочай клясай змагаюцца пад кіраўніцтвам партыі за бальшавіцкія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва.

* У заключэньне тав. **Емяльянаў** спыняецца на тых вялізарных задачах, якія стаяць перад інжынэрна-тэхнічнымі работнікамі. Паставіць як сьлед унутрызаводзкае плянаваньне, няўхільна праводзіць гаспадарчы разрахунак у брыгадах, разгарнуць зьменна-сустрэчнае і тэхнічнае плянаваньне, дапамагчы рабочым у распрацоўцы рацыяналізатарскіх прапаноў і вынаходзтваў, забясьпечыць аўладаньне тэхнікай шырокімі масамі рабочых — вось кошлекс задач, ажыцьцяўленьне якіх будзе служыць асноўным паказальнікам работы кожнай сэкцыі, кожнага ІТР. Задачы, якія стаяць перад ІТР, патрабуюць павышэньня іх кваліфікацыі і адпаведнай пастаноўкі марксыцка-ленінскага выхаваньня.

* Пасьля дакладу тав. Емяльянава з дакладам аб рабоце БелМБІТ выступіў тав. **Казімірчык.**

Дакладчык радам лічбаў ілюстраваў дасягненьні інжынэрна-тэхнічных сэкцый БССР у барацьбе за прамфінплян, за аўладаньне тэхнікай, за заваяваньне тэхнічна-эканамічнай незалежнасьці. На працягу 1931 году ІТР унесьці 2.270 прапаноў, асаблівы рост прапаноў меў месца ў чацьвертым квартале мінулага году. Пераразбарчая кампанія інжынэрна-тэхнічных сэкцый была праведзена, як масавая кампанія, яна прайшла пад знакам рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна і павароту ІТР тварам да вытворчасьці.

Значна павялічылася пралетарская праслойка сярод ІТР. Сярод спэцыялістаў налічваецца 41,3 проц. рабочых і 26,7 проц. працоўных сялян.

* Тав. **Казімірчык** адзначае рад слабых месц у рабоце ІТС. Інжынэрна-тэхнічныя сэкцыі яшчэ не зрабілі справы аўладаньня тэхнікай асновай усёй сваёй работы. На многіх прадпрыемствах сэкцыі яшчэ не перабудавалі сваёй працы тварам да вытворчасьці, у сувязі з чым дрэнна стаіць справа з тэхнічным плянаваньнем, унутрызаводзкім пармаваньнем, улікам работы гаспадарча-разрахунковых брыгад. Барацьба за зьніжэньне сабекошту, за эканомію аналу не знайшла належнага адбітку ў рабоце інжынэрна-тэхнічных сэкцый. У зусім нездавальняючым становішчы знаходзіцца справа марксыцка-ленінскага выхаваньня мас спэцыялістаў. Зьезд павінен даць пералом у галіне перабудовы работы інжынэрна-тэхнічных сэкцый, на аснове 6 умоў тав. Сталіна.

* З увагай заслухаў зьезд прывітаньне прадстаўніка газэты «Рабселькор» тав. Чарнякова, які спыніўся на вялізарных дасягненьнях бальшавіцкага друку ў барацьбе за прамфінплян, у змаганьні за аўладаньне тэхнікай. Тав. Чарнякоў заклікаў зьезд да дружнай супольнай работы разам з нізавым заводзкім

т. ФЭЛЬДМАН — дэлегат зьезду ад ІТР Віцебску. Былы чорнарабочы Знатаўтаўскага заводу. Скончыў віцебскі вечарні тэхнікум. Вынаходца-рацыяналізатар.

друкам па ажыцьцяўленьні ўказаньняў тав. Сталіна аб аўладаньні тэхнікай.

У спрэчках па дакладах выказаліся тав. **Вашамірскі** (Крычаўскі цэмзавод, **Корзін** (сэкцыя МТС), **Кабан** (дэпо чыгункі Гомель), якія падкрэсьлілі, што БелМБІТ мала ўвагі аддавалі работе інжынэрна-тэхнічных сэкцый у галіне сельскай гаспадаркі.

Дзеньнік зьезду

На вэчэрнім пасяджэньні зьезду 8 мая працягваліся спрэчкі па дакладах УсеМБІТ і БелМБІТ. Выказалася 16 асоб: тав. **Кофман** (Гомсельмаш), **Бушко** (Лесправ), **Сімкін** (Слуцак), **Аксэльрод** (Менск), **Бранароў** (завод «Балшавік»), **Новікаў** (БелДРЭЎ), **Дубаў** (шаўковая фабрыка, Магілеў), **Пляско** (НДІ, Менск), **Лысюк** (Гомель), **Кальніцкі** (Віцебскі гарМБІТ), **Іваноў** (чыгунка Гомель), **Брук** (віцебская гарбарня), **Гітман** (гарМБІТ, Менск), **Якімаў** (Бабруйск), **Сарнізаў** (шоўкавая фабрыка, Магілеў), **Каганоўскі** (Магілеў). З прывітальнай прамовай ад імя Беларускай Акадэміі Навук выступіў прэзыдэнт Акадэміі Навук тав. **Горын.**

З рапартам зьезду выступілі: прадстаўнік Бярэзінскага камбінату тав. **Мышкоўскі** і ад ІТР гомельскай МТС — тав. **Будніцкі.**

Кіруючыя органы IV Усебеларускага зьезду ІТР

ПРЭЗЫДЫУМ

Гікало, Галадзед, Шаранговіч, Жаброўскі, Рыскін, Іваноў, Чарвякоў, Калнін, Гантман, Рыжаў, Л. Гурэвіч, Емяльянаў, Казімірчык, Грысевіч, Шапіра, Кавалёў, Ляхаў, Амбражунас, Рачыцкі, Горын, Гарын, Ленцнэр, Аграноўскі, Шаліма, Гітман, Фурман, Лапко, Айзман, Цымяровіч, Багданоў, Аксэльрод, Калніцкі, Бетко, Даўбор, Якімаў, Горшман, Драчоў, Кастрыцкі, Якушка, Майсееў, Курцін, Мінкін.

Дадаткова выбраны ў прэзыдыум — нямецкая дэлегацыя т. т. Кароль і Блюмэ.

ГАНАРОВЫ ПРЭЗЫДЫУМ

Палітбюро ЦК УсеКП(б)
Рудзутак
Постышаў
Гікало
Швэрнік
Тэльман
Блюхэр
Ленскі
Корчык
Максім Горкі

САКРАТАРЫЯТ

Штыцько, Кішкурна, Кофман, Алмазаў, Бубноў.

МАНДАТНАЯ КАМІСІЯ

Гурэвіч, Бушко, Каганоўскі.

Н. Наумаў

АСНОЎНЫЯ ЗАДАЧЫ АГІТАЦЫЙНА-МАСАВАЙ РАБОТЫ

На VIII зьезьдзе партыі па пытаньні аб партыйнай праграме Леніна гаварыў, што наша праграма павінна быць кіраўніцтвам для агітацыі, што кожны параграф гэтай праграмы зьмяшчае ў сабе сотні тысяч прамоў і агітыкулаў агітатараў. Пастановы XVII партканфэрэнцыі паказваюць, як партыя канкрэтна і па-ленінску ажыцьцяўляе праграму ўсеКП(б) на адказьнейшым этапе барацьбы за сацыялізм. Гэтыя пастановы зьяўляюць кіраўніцтвам для агітацыі, напаўняюць задачы агітацыйна - масавай работы новым зьместам і высоўваюць рад новых задач.

Асаблівае значэньне для агітацыйна - масавай работы набываюць пастановы XVII канфэрэнцыі ўсеКП(б) па дакладу тав. Молатава аб перамаганьні буржуазных і дробнабуржуазных забабонаў сярод працоўных і вядзеньні настойлівай работы па сацыялістычным іх перавыхаваньні.

На кожным заводзе можна часта наглядаць жывыя факты таго, як выхаваньне сьвядомых сацыялістычных адносін да працы і да мэханізмаў ускрывае вялікія магчымасьці для паскарэньня тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва і выяўляе новыя рэзэрвы для барацьбы за плян.

Выхаваньне сацыялістычных сьвядомых адносін да працы праходзіць у абстаноўцы супраціўленьня варожых нам элемэнтаў. Указаньне XVII канфэрэнцыі ўсеКП(б), што «ў далейшым нямінуча абвастрэньне клясавай барацьбы ў асобныя моманты і асабліва ў асобных раёнах і на паасобных вучастках сацыялістычнай будоўлі... што з прычыны гэтага перад партыяй стаіць задача ўмацаваньня пралетарскай дыктатуры і далейшага разгортваньня барацьбы з апартунізмам і асабліва з правым ухілам як галоўнай небясьпекай на даным этапе», — патрабуе ад усёй сыстэмы агітмасавай работы, далейшага ўзмацненьня партыйнай вострасьці яе ўзьдзейнасьці на масы, больш гібкасьці, апэрацыйнасьці, канкрэтнасьці і значнага паляпшэньня яе якасьці. Асабліва важна работа ў гэтым напрамку сярод новых кадраў рабочых.

Пастановамі XVII канфэрэнцыі ўсеКП(б) пастаўлена задача ператварэньня ўсяго працоўнага насельніцтва краіны ў актыўных і сьвядомых будаўнікоў бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва. А гэта патрабуе ад партыйных арганізацый на прадпрыемствах пагалоўнага і поўнага ахопу рабочых і работніц агітацыйна - масавай работай. Задача гэта тым больш складаная, што ахоп гэты павінен быць дыфэрэнцыяваны з улікам асаблівасьцяй розных груп (пластоў) рабочых. Чым больш новых рабочых і работніц уліваецца ў прамысловасьць, чым адказьней і складаней становяцца чарговыя задачы партыі, тым вастрэй становіцца задача пагалоўнага і дыфэрэнцыяванага ахопу мас палітыкай партыі.

Неабходнасьць дыфэрэнцыяванага ахопу цесна зьвязана з вострапасьпешнай патрэбнасьцю рэзкага паляпшэньня якасьці нашай агітацыі. Нельга ад полькава падыходзіць да повага рабочага і старога кадравіка. Нельга адполькава падыходзіць да рабочых вядучых прафэсій, чорнарабочых, да моладзі і дарослых і г. д. Лінія партыі, яе лёзунгі — адны і тыя-ж для рабочай клясы і ўсіх працоўных у цэлым. Але, каб ліквідаваць да канца чужыя бальшавіцкай агітацыі недахопы (траскатня, агітацыя «на ўра»), якія стваряюць відзімасьць агітацыі, але ня могуць забясьпечыць сапраўдную мабілізацыю мас на бальшавіцкае выкананьне чарговых задач партыі, трэба ясна і дыфэрэнцыявана, канкрэтна растлумачыць, што іменна і як трэба паступіць, каб выкапаць чарговую задачу.

Падцягнуць адсталага рабочага да ўзроўню ўдарніка гаспадарча - разрахунковых брыгад, раўняць усю масу ўдарнікаў на самых перадавых, мабілізаваць усе магчымасьці на паскарэньне тэмпаў з дня ў дзень і з дэкады ў дэкаду — вось у чым умовы пасьпяховага завяршэньня першай пяцігодкі ў 1932 годзе і пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва ў другой пяцігодцы. Пастановы XVII партканфэрэнцыі ажыцьцяўляюць на мільёнамі працоўных, і ясна, што гэтыя мільёны павінны быць пагалоўна мабілізаваны на бальшавіцкую барацьбу за плян.

Посьпехамі партыі створаны ўсе неабходныя прадпасылкі, падрыхтавана рэальная база для пасьпяховага выкананьня гэтай рашаючай задачы.

Палітыка партыі, яе генэральная лінія і яе кіраўніцтва карыстаюцца поўным падтрыманьнем мас, як палітыка адзіна правільная і праверана ў барацьбе.

Створана выстарчальная колькасьць палітычна падрыхтаваных адданых партыі, якія карыстаюцца аўтарытэтам у масах і з масамі зьвязаны, агітатараў бальшавікоў, арганізатараў мас.

Партыя мае вялікі вопыт работы ў масах, набыты ў пралетарскай барацьбе за масы, за дыктатуру пралетарыяту, за сацыялістычнае будаўніцтва. Гэты вопыт складаецца са спалучэньня трохадзінай задачы бальшавіцкай мабілізацыі мас — агітацыі, прапаганды, арганізацыі.

Партыя ўзброена вучэньнем Маркса - Леніна - Сталіна, якое дае ёй магчымасьць у адпаведнасьці з асаблівасьцямі абстаноўкі, якую яна зараз перажывае, правільна вызначыць свае задачы і разгарнуць перад масамі ясную праграму за іх ажыцьцяўленьне.

Толькі правыя апартуністы, або апартуністы іншых адценьняў у радох партыі і контр-рэвалюцыйныя трацкісты могуць сумнявацца ў паяўнасьці ўсіх гэтых прадпасылак.

Партыя налічвае звыш 3 млн. камуністаў. Яна ідэйна моцна і па-ленінску згуртавана вакол бальшавіцкага ЦК на чале з тав. Сталіным. У Леніна і Сталіна партыя вучылася па майстэрску ўладаць мастацтвам узначаленьня мас — мастацтвам агітацыі, прапаганды і арганізацыі іх на справу ажыцьцяўленьня сваёй палітыкі. Значна ўзрасла сетка ячэек у партыі (каля 100 тыс.), створаны партыйныя і іншыя масавыя зьвяньні ў саміх нізох (брыгады, пралёт, камплект і інш.)

Попараўнальна вырасла маса камуністаў, якія працуюць на вытворчасьці. Сотні тысяч камуністаў, камсамольцаў і перадавых беспартыйных рабочых штогод прапускаюцца праз сетку партыйнай асьветы, павышаюць свой тэарытычны ўзровень на аснове вывучэньня марксызму - ленінізму і папаўняюць рады актыўных агітатараў партыі. Яны прымаюць удзел ва ўдарніцтве і сацспаборніцтве і тым самым агітуюць паказам як трэба працаваць на сацыялістычнай вытворчасьці.

Лёзунг — «кожны камуніст — актыўны агітатар партыі» павінен стаць самым баявым лёзунгам для ўсіх партарганізацый прадпрыемстваў. Яго трэба ажыцьцявіць цэлай сумай практычных мерапрыемстваў, у злучнасьці з усімі сэктарамі парт'ячэек. Культпроп—па лініі адпаведнага падкрэсьліваньня гэтай задачы ў практыцы рабочай сеткі партыйнай асьветы. Аргінстр — па лініі такой арганізацыі календара работы і парт нагрузак, каб камуніст, побач з вытворчымі задачамі, прымацоўваўся да групы беспартыйных для работы з імі. Але самая вялікая задача стаіць перад агітмасавікамі. Яны павінны ўлічыць і ведаць усіх камуністаў групы і ячэйкі, ведаць падрыхтаванасьць кожнага з іх да выкананьня тэй, або іншай нагрузкі па агітмасавай рабоце, даваць ім адпаведныя заданьні, дапамагаючы пры гэтым радавому камуністу весьці гутарку з рабочымі.

Ва ўсёй нашай рабоце па выхаваньні армії рабочых агітатараў мы павінны выходзіць з той галоўнай устаноўкі, што па-бальшавіцку агітаваць — гэта значыць узначаліць масу і арганізаваць яе так, каб лінія партыі перамагла па кожным даным вучастку барацьбы. Мы павінны кіравацца ленінскім стылем агітацыі.

Ленін заўсёды надаваў выключна важнае значэньне перакапаўчай, вытрымкай і зразумелай для мас агітацыі.

Бальшавікі: «... павінны ўмець гаварыць проста і ясна, на даступнай масам мове, адкінуўшы рашуча проч цяжкую артылерыю мудрых тэрмінаў, замежных слоў, завучаных гатовых, але не зразумелых яшчэ масе, незнаёмых ёй лёзунгаў, акрэсьленьняў, заключэньняў. Трэба ўмець бяз фраз, бяз воклічаў, з фактамі і лічбамі ў руках растлумачыць пытаньні сацыялізму і пытаньні сучаснай рускай рэвалюцыі» (Ленін т. VII, ч. II, выд. 1925 г., стар. 134-135).

Вось у гэтым — арганізуючая сіла агітацыі ў Леніна. Гэтай сіле павінны вучыцца растучыя агітатарскія кадры. Стылем ленінскай агітацыі павінен аўладаць кожны камуніст. Гэтаму трэба вучыцца ў Леніна і Сталіна, вучыцца на выступленьнях т. Кагановіча і іншых кіраўнікоў нашай партыі.

Тав. Сталін надае вялікае значэньне масавым кампаніям для справы паскарэньня нашых тэмпаў:

«Нам трэба павесьці кампанію за зьніжэньне прагулаў на заводах і фабрыках, за ўзьнёсьце прадукцыйнасьці працы, за ўмацаваньне працоўнай дысцыпліны на нашых прадпрыемствах. Дзесяткі і сотні тысяч рабочых дзён трацяцца для прамысловасьці з прычыны прагулаў. Сотні тысяч і мільёны прападаюць з прычыны гэтага ў страту нашай прамысловасьці, у страту індустрыі» (Сталін).

У мэтах мабілізацыі рэзэрваў, захаваных у нетрах нашага ладу, для справы паскарэньня тэмпаў, для выкананьня адказьнейшых задач партыі на сучасным этапе трэба дабіцца пагалоўнага і дыфэрэнцыяванага ахопу мас партыйным учыльвам, трэба актывізаваць барацьбу з «левацкай» недацэнкай групавой і індывідуальнай агітацыі, трэба пакончыць з нагардлівымі адносінамі да агітацыі, якія ёсьць на паасобных прадпрыемствах, трэба адхіліць недахопы агітацыі, якія там ёсьць, адсутнасьць канкрэтнасьці і элемэнты адставаньня, з аднаго боку, і абмежаваньне яе толькі «задачамі мінуты» — з другога.

Нельга дэмагагічна і безадказна адыходзіць ад «вузка-жыцьцёвых» пытаньняў адсталых груп рабочых. Трэба ўмець так адказваць на «мінутныя» і «вузка-жыцьцёвыя» пытаньні, каб самы адсталы рабочы зразумеў, што ўсеКП(б) — адзіная партыя, якая карэнным чынам вырашае канчаткова і да канца вырашыць задачы поўнага паляпшэньня матар'яльнага, культурна-бытавога становішча мас.

Такім шляхам магчыма ўзьнімаць адсталага рабочага ад дробных пытаньняў дня да зразуменьня агульнай палітыкі партыі, да зразуменьня гістарычных задач пралетарыяту, як клясы, які заклікан канчаткова ліквідаваць клясы і прычыны іх паражэньня, пабудаваўшы ў другую пяцігодку бясклясавае сацыялістычнае грамадзтва.

Задачу ўцягненьня ўсёй масы камуністаў у актыўную агітацыйную работу трэба вырашаць адначасова з арганізацыяй адбору больш вопытных агітатараў, ставячы іх на больш адказныя, больш важныя вучасткі агітмасавай работы. Спалучэньню гэтых дзьвюх задач дае магчымасьць ахапіць рабочага ня толькі на прадпрыемстве, але і па-за прадпрыемствам.

Для вырашэньня задачы дыфэрэнцыяванага і высокаякаснага ахопу вялікае значэньне мае арганізацыя кожнай ячэйкі і райкомам уліку настроіў рабочых і вывучэньне іх запатрабаваньняў.

«Агітацыя не павінна быць застыўшай, агітацыя патрабуе найвялікшага пачуцьця да запатрабаваньняў мас у кожны момант» (Кагановіч).

Трэба ведаць, якія іменна настроі і прапановы па даным канкрэтным пытаньні характэрны для данай групы рабочых, адкуль і чаму тыя ці іншыя настроі зьявіліся.

А для гэтага трэба арганізаваць сыстэматычны ўлік настроіў і прапаноў рабочых, улічваючы іх пры распрацоўцы планаў, гутарак, сходаў і мітынгаў, трэба кантраляваць і правяраць, як прапановы рабочых рэалізуюцца.

Пры перабудове работы трэба зыходзіць з абавязковага ўліку новых задач, новых форм і новых дасягненьняў у масах. Але ніколі перабудова работы не азначае, што трэба адмовіцца ад старых форм зусім калі новая абстаноўка патрабуе толькі зьмены зьместу. А што атрымалася з мітынгамі пэхавымі, заводзкімі і раённымі? На цэлым радзе прадпрыемстваў як сыстэма агітацыйна-масавай работы яны перасталі практыкавацца. Чаму? Хіба-ж хто зможа адкуляць той факт, што для некаторых груп рабочых мітынгі захавалі ўсё сваё значэньне. Хіба-ж можна сумнявацца ў тым, што паасобныя факты з міжнароднага і ўнутранога становішча СССР, ці павет з жыцьця паасобных ударных брыгад, цэхаў і заводаў побач з друкам лепш за ўсё і хутчэй за ўсё можна давесьці да ведама мас іменна праз сыстэму мітынгаў.

Неабходна толькі правільна паставіць падрыхтоўку мітынгаў і масавых рабочых сходаў. Іх трэба падрыхтоўваць і праводзіць не парадным трафаратам, а вострым вагаром мабілізацыі актыўнасьці мас на выкананьне канкрэтных задач.

Мы закрануль тут толькі некаторыя галоўным чынам арганізацыйныя пытаньні агітацыйна-масавай работы на прадпрыемствах. І нават гэтыя паасобныя пытаньні ўказваюць на необходнасьць іншага падыйсьці да пастаноўкі агітмасавай работы, чым мы часта падыходзім. Ад агітацыі паогул — да агітацыі канкрэтнай і мабільнай, з якой заўсёды сьледуе арганізацыя мас. Ад кампаній, паміж сабой новы старчальна зьвязаных, — да сыстэмы такіх арганізаваных мер, якія паводзяць пад кампаніі новую, больш глыбокую базу, да арганізацыі агітацыйнай работы кожнага камуніста і вялікай колькасьці групавых агітатараў. Ад абмежаваньня актыўнага ўдзелу ў правядзеньні кампаній вузкім актывам — апэраваць вялікімі атрадамі пэлымі масамі агітатараў. Тварам да індывідуальнай і групавой агітацыі да перападрыхтоўкі агітатараў, да іх інструктажу. Больш розпастайнасьці, больш жыцьця, больш увагі да падрыхтоўкі масавых сходаў. Больш спалучэньня і ўзаемадзеяньня розных форм агітацыі: вуснай, друкаванай наглядная. Больш глыбокай сувязі паміж рознымі сэктарамі парт'ячэек заклікаными вырашаць адну і тую-ж задачу — мабілізацыі мас на выкананьне чарговых задач партыі.

Брыгад на пасьпяховае выкананьне на 20-30 проц. Салдаценка.

ПРАДВЫБАРЧАЯ СПЭКУЛЯЦЫЯ ФРАНЦУСКАЙ БУРЖУАЗІІ НА СЬМЕРЦІ ДУМЕРА

Дальшыўкамі францускі імпэрыялізм благаслаўляе белагвардзейшчыну на новыя крывавыя авантуры

Спэкуляцыя ўрадавых партый на забойстве

ПАРЫЖ, 8. Выканком **радыкальцыялістычнай партыі** апублікаваў камунікэ, дзе перасьцярагае грамадзкую думку супроць тэндэнцыёзных, скандальных інтэрпрэтацый падзеі, якая павінна выклікаць ва ўсіх французаў пачуцьцё суму. Адначасова рэспубліканска-сацыялістычная партыя (група Пэнлевэ, былая Брыяна) таксама апублікавала камунікэ, указваючы **тэндэнцыёзны характар** пэўнай інфармацыі адносна замаху на рэзыдэнта рэспублікі. Рэспубліканска-сацыялістычная партыя рэкамэндуе выбаршчыкам ня даць сябе ашуканць ілжывымі чуткамі, якімі прабуюць надаць палітычны характар злачынству вар'ята. Афіцыяльнае камунікэ дзьвюх надзвычай уплывовых лева-буржуазных францускіх партый зусім выразна дэзавуюе камунікэ міністра ўнутраных спраў і **выкрывае перадвыбарчы манэўр урадавых партый.**

Радыкальны друк рашуча ўказвае, што Гаргулоў — белагвардзеец, фашыст. Аднак, агаварваецца, што з гэтага не вынікаюць ніякія вывады ў адносінах да рускай эміграцыі.

«Лева»-радыкальная **«Рэпюблік»** рэзка нападае на заяву Мільерана, што забойца належаў да «рэгулярных бальшавіцкіх сіл». Газэта напамінае, што Мільеран у 1924 годзе быў выгнан з прэзыдэнцкага паста і што ён дарэмна прабуе зноў вылезьці з падварэтні.

Паводле паведамленьня францускага друку, Гаргулоў па допытах, нібы, упарта маўчыць. Сьледчыя ўлады парашылі камандыраваць у Бэрлін, Манака, Прагу, Швэйцарыю, Ліён чыноў паліцыі для ўстанаўленьня сьлядоў сувязі Гаргулова. Жонка Гаргулова прыбыла ў Парыж і дастаўлена ў крымінальную паліцыю.

Старшыня сэнату **Легрэн** згадзіўся высунуць сваю кандыдатуру на пост прэзыдэнта рэспублікі. Мяркуюць што ён будзе выбран значнай большасьцю. Высоўваюць таксама кандыдатуру Пэнлевэ.

Урадавае паведамленьне —узор крывадушнай інсінуацыі"

ПАРЫЖ, 8. Блюм у «Пэпюлер» піша: «у сваёй адозьве да народу ўрад з правіўў годнасьці і пайшоў на перарэз адзінству нацыі і краіны. Міністры і паліцэйскія, на якіх кладзецца такая цяжкая адказнасьць, пастараліся **выкарыстаць трагічную катастрофу для выбарчага манэўру** ў апошні момант. Паведамленьне, выпушчанае ў ноч забойства, ёсьць **узор крывадушнай інсінуацыі:** вар'ят аказваецца сымулянтам, белы фашыст ператвараецца ў агента ДПУ, ізаляваны акт вар'ята ператвараецца ў змову цэлай партыі. Гэта свайго роду **бірлавы манэўр,** які капчаткова дыскрэдытуе сваіх аўтараў».

Камунікэ міністра ўнутраных спраў—хлусьня

ПАРЫЖ, 8. «Юманітэ» выдала спэцыяльны выпуск у якім піша: «міністар унутраных спраў, абараняючы белых, прабуе зрабіць нізкую дывэрсію за кошт кампартыі і Камінтэрну. Камунікэ міністра ўнутраных спраў — суцэльная хлусьня. Гаргулоў па ўласным прызнаньні — афіцэр Дзянікіна, Урангеля, эмігрант з 1919 году, заснавальнік у 1930 годзе ў Празе фашысцкай групы, якая імкнулася выклікаць вайну супроць СССР. Ён зьвязан з белагвардзейскімі дзеячамі і мог жыць і дзейнічаць у Францыі **толькі пад апекай улад.** Урад пазьмешна адхіляў,—гаворыць газэта,—патрабаваньне кампартыі аб высылцы белагвардзейцаў, бо баяўць у іх зброю на выпадак інтэрвэнцыі. Газэта заклікае патрабаваць выгнаньня ўсіх белых».

Чэхаславацкае тэлеграфнае агенцтва робіць Гаргулова вар'ятам

ПРАГА, 8. Чэхаславацкае тэлеграфнае агенцтва паведамляе: людзі, якія ведалі Гаргулова ў Мэдышу, Прэрове гавордаць, што ён быў хворы на псыхічнае расстройства. Абмяркоўвалася пытаньне аб зьмяшчэньні яго ў псыхіятрычную лячэбніцу. Гаргулоў меў нярэгулярнасьці з паліцыяй за дэбошы ў публічных мясцох. Ён ня раз надакучваў урадам парадамі, як перамагчы яўрэйства, бальшавізм, бо «толькі такім чынам можа быць выратаван увесь сьвет».

ЯПОНСКА-КІТАЙСКАЯ „ЗГОДА" ПАДПІСАНА

Поўная капітуляцыя Нанкіна

ШАНХАЙ. 5 мая падпісан ангельскі тэкст японска-кітайскай згоды.

Агенцтва Гомінь паведамляе тэкст згоды. Апошняя складаецца з пяці пунктаў і трох дадаткаў:

ПЕРШЫ ПУНКТ прадугледжвае поўнае спыненьне варожых дзеяньняў, пачынаючы з 5 мая. Войскі абедзьвюх дзяржаў, паколькі гэта ад іх залежыць, спыняюць усе формы варожых актаў у раёне Шанхаю. Калі ўзьнікнуць сумненьні наконт спыненьня варожых дзеяньняў, становішча спраў павінна быць сьведчана прадстаўнікамі трэціх дзяржаў — удзельнікаў згоды.

ДРУГІ ПУНКТ указвае, што кітайскія войскі застаюцца на цяперашніх пазыцыях аж да наступных пастаноў аб аднаўленьні нармальных умоў у раёнах, аб якіх ідзе гутарка ў гэтай згодзе. Пазыцыі кітайскіх войск указаны ў дадатку першым.

ТРЭЦІ ПУНКТ указвае, што японскія войскі адкліканцца на тэрыторыю чужаземнага сэтльмэнту, у раён дарог, дзе вядуць з сэтльмэнту ў Хонкю, і ў раён Хонкю, як гэта было да інцыдэнту 28 студзеня. Мяркуецца, што з пачыны значнай колькасьці японскіх войск, частка іх будзе часова размешчана ў мясцох, якія мяжуюцца з вышэйуказанымі раёнамі. Гэтыя месцы указаны ў дадатку другім.

ЧАЦЬВЕРТЫ ПУНКТ прадугледжвае стварэньне зьмешанай камісіі, уключаючы прадстаўнікоў трэціх дзяржаў, прыбуўшых удзел у заключэньні згоды. Камісія сьведчыць двухбаковае адкліканьне войск і супрацоўнічае ў справе перадачы кітайскай паліцыі эвакуяваных японскімі войскамі раёнаў. Кітайская паліцыя займае гэтыя раёны па меры адпіканьня японскіх войск. Склад і працэдура работы камісіі вызначаюцца дадаткам трэцім.

ПЯТЫ ПУНКТ указвае, што згода ўступае ў моц са дня яе падпісаньня. Ангельскі тэкст зьяўляецца абавязковым.

ПЕРШЫ ДАДАТАК вызначае лінію разьмяшчэньня кітайскіх войск: ад раёну ракі Сучжоў да пункту Хупэйкоу на рацэ Янцзы.

У выпадку ўзьнікненьня сумненьняў, разьмяшчэньне кітайскіх войск павінна быць засьведчана прадстаўнікамі трэціх дзяржаў, якія прымаюць удзел у заключэньні згоды.

ДРУГІ ДАДАТАК вызначае раёны, якія прадугледжваюцца пунктам трэцім, і ўказвае, што па ўзаемнай згодзе, з раёну разьмяшчэньня японскіх войск выключаюцца вёска Усун і некаторыя іншыя пункты, а таксама, што японскія ўлады ня будуць умешвацца ў апэрацыі Шанхай-Усунскай чыгункі і яе майстэрань. У дадатку ўказваецца, што адкліканьне японскіх войск пачнецца на працягу бліжэйшага тыдню і будзе поўнасьцю завершана на працягу 4-х тыдняў з моманту яго пачатку.

ТРЭЦІ ДАДАТАК указвае, што зьмешаная камісія складаецца з 12 членаў, а іменна: па адным грамадзянскім і адным ваенным прадстаўніках ад кітайскага, японскага, амэрыканскага, ангельскага, францускага і італьянскага ўрадаў. Камісія можа прыцягнуць такую колькасьць памочнікаў, якую яна палічыць неабходнай. Пастановы камісіі прымаюцца бальшасьцю галасоў. Старшыня камісіі карыстаецца рашаючым голасам пры роўнасьці галасоў. Старшыня камісіі павінен быць выбран з ліку членаў камісіі, якія прадстаўляюць трэція дзяржавы і прымаюць удзел у заключэньні згоды. Камісія павінна нагладаць за правядзеньнем у жыцьцё першага, другога і трэцяга пунктаў згоды і ўпаўнаважана зварочаць увагу на выпадкі парушэньняў згоды.

Японскае агенцтва Сімбун Рэнго публікуе тэкст мірнай згоды, апускаючы дэкларацыю кітайскіх прадстаўнікоў, да даную да згоды.

Паводле паведамленьня агенцтва Сімбун Рэнго, штаб японскіх войск паведаміў кітайскім уладам і зьмешанай камісіі, што адыход японскіх войск пачнецца заўтра. (ТАСС).

Вызаў японскай ваеншчыны ПАЗШ

ТОКІЁ, 8. Публіцыст па ваенных пытаньнях Хірота ў часопісі «Хайзо» разглядае (планы японскага і амэрыканскага флётаў у азіяцкіх водах у выпадку сутычкі. Хірота пералічвае 55 ваенных суднаў азіяцкай эскадры ПАЗШ і ўказвае, што эскадра ПАЗШ, за выключэньнем судна «Хаустон», складаецца з устарэлых адзінак. Паветраны флёт ПАЗШ польга лічыць вельмі сур'ёзнай пагрозай японскім паветраным сілам. Ангельская эскадра мацнейшая за эскадру ПАЗШ. Флёт Францыі, Італіі, Кітаю можна ня прымаць пад увагу. У 1932 годзе абсалютная перавага ў залёна-ўсходніх водах належыць японскаму флёту. Флёт ПАЗШ пацерпіць параразьненьне ў бой з японскім флётам. Морскі штаб ПАЗШ ня зможа ніяк выпрацаваць стратэтычнага пляну морскай вайны ў Ціхім акіяне. Праз 5-6 год японскі флёт будзе роўны 60 проц. амэрыканскага. Таму цяпер трэба пакласьці ў аб выпрацоўцы пляну 1 мерапрыемстваў, якія забясьпечаць перамогу японскаму флёту над другіх суседніх сіл.

Чэкаславацкае тэлеграфнае агенцтва робіць Гаргулова вар'ятам

ПРАГА, 8. Чэхаславацкае тэлеграфнае агенцтва паведамляе: людзі, якія ведалі Гаргулова ў Мэдышу, Прэрове гавордаць, што ён быў хворы на псыхічнае расстройства. Абмяркоўвалася пытаньне аб зьмяшчэньні яго ў псыхіятрычную лячэбніцу. Гаргулоў меў нярэгулярнасьці з паліцыяй за дэбошы ў публічных мясцох. Ён ня раз надакучваў урадам парадамі, як перамагчы яўрэйства, бальшавізм, бо «толькі такім чынам можа быць выратаван увесь сьвет».

ПАРА, ЯКАЯ НЕ ПАЧЫНАЕЦЦА І НЕ КАНЧАЕЦЦА

„Газэта Варшавска" аб становішчы польскай вёскі

Польская вёска, а яшчэ ў большай ступені вёска Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, перажываюць цяжкія дні. Нячуваны яшчэ ў гісторыі па разьмерах і глыбіні эканамічны крызіс, патрасаючы асновамі капіталістычнай сыстэмы, з асаблівай сілай ударае па дматмільённых сялянскіх масах.

Працоўнае сялянства і асабліва яго найбяднейшыя пласты, на ўсім працягу існаваньня незалежнай польскай дзяржавы перажывалі хранічны голад. Ён быў больш або менш вострым, у залежнасьці ад эканамічных канюнктур, **але ніколі ня мінаў.**

Памешчыцка-капіталістычная эксплёатацыя, самая барбарская, якой шэўна пазайдросьціў-бы не адзін страп Інда-Кітаю, або Інданэзіі, паткоўны прэс, зацісканьне якога ідзе больш шпаркімі тэмпамі, чым паглыбленьне крызісу, палітыка выхады з крызісу коштам шырокіх народных мас, — **усё гэта абумовіла далейшы спад сельскай гаспадркі, яе тэхнічны рэгрэс і паставіла вёску на край катастрофы.**

Гэта даўно ня лічыцца сакрэтам нават у Польшчы. Буржуазная прэса сіх напрамкаў і адценьняў, прэса, якая прыкладала ўсе свае сілы і прыт, каб захаваць сапраўдны стан рэчаў — нават гэта прэса цяпер прыбушана гаварыць аб катастрафічнасьці становішча на вёсцы. І цікава тое, што тон гэтых разважаньняў далёкі ад спакойнага. **Гэта — суцэльны крык галоснага буржуя, які бачыць нараданьне рэвалюцыі, чуе падземныя штуршкі вулькану пад сваімі нагамі.**

Мы ніжэй даслоўна перадрукоўваем артыкул «Газэты Варшавскай», зьмешчаны ў № 131 за 1 мая 1932 году. Артыкул надзвычай характэрны. Падаючы эндэцкі орган у згушчэньні фарбаў хіба ня прыходзіцца:

«Пшаднувэк», час перад жнівом, час пустых гумнаў і сьвірнаў, пачынаўся звычайна больш-менш кепка касавіцы, залежна ад заможнасьці данага гаспадара — **ЦЯПЕР У БОЛЬШАСЬЦІ ГАСПАДАРАК ЁН ПАЧАЎСЯ ЗАРАЗЖА ПАСЬЛЯ КАЛЯД.**

Чаму? Няўжо вядомыя сваёй ашчаднасьцю і гаспадарныя па сваёй натуры нашы сяляне гаспадарылі сёлета неашчадна і раскідаліся плёнамі сваёй працы?

Не. АЛЕ ЎСЁ, ШТО СЕЛЯНІН САБРАЎ З ПАЛЕЎ У МІНУЛЫМ ГОДЗЕ, ЛЕДЗЬ ХАПІЛА ЯМУ НА АПЛАТУ ПАДАТКАЎ. Дзяржаўныя падаткі — яшчэ так-сяк. Але вось гэтыя гмінныя павятовыя, дарожныя...

Яны зьелі большасьць жніва!

Падаткі ў гэтым годзе хоць і ня былі лічбова павышаны, але для селяніна цяжар іх узрос у шмат разоў з прычыны нізкіх цэн на збожжа. У выніку — барочы за асноду цэнтнэр збожжа, — селянін плаціць сёньня, у часе крызісу, найцяжэйшы падатак.

Цяпер, вясной, за збожжа крыху больш плацяць. Але што з гэтага? Хто яго мае? На гэтым узросьце цэн зарабіла толькі невялічкая група вясковых багатыроў-капіталістаў і гарадзкія спэкулянты.

ВЁСКА ЯК МАЕ ЧАГО ПРАДАВАЦЬ. У выпадку неадкладнай патрэбы грошай, у выпадку хваробы, або сьмерці, — СЕЛЯНІН ПРАДАЕ АБО ЗАКЛАДАЕ АПОШНІ КАЖУХ, ІНВЭНТАР. НА РЫНАК ПЛЫВУЦЬ ПАДУШКІ, ПЯРЫНЫ.

Гэта вялікая трагэдыя для гаспадыні. Удрыгоманыя істужкамі, вышывэныя, зложаныя пірамідай на ложку, ніколі ня ўжываныя — гонар гаспадыні — цяпер плывуць, аблітыя сьлязьмі на рынак!

Нават у самых заможных раёнах — у Сэрадзкім і Каліскім сялянскія сем'і ад вялікадня НЯ БАЧЫЛІ І Ў ВОЧЫ ХЛЕБА. Хіба толькі на сьвята, купленны за апошнія грашы ў горадзе. Хлеб з гораду — у вёску!

Сем'і такія харчуюцца выключна бульбай. ЧАСАМ НАВАТ БЯЗ СОЛІ. Яйкі, масла — трэба прадаваць. Хоць і на іх малы попыт, але пару грошаў трэба ўсё-ж такі мець. На запалкі, на газу, хоць яе купляюць не на тое, каб увечары паліць. Сяляне кладуцца спаць пры змроку. Газа так, для выпадку: можа хто захварэе, часам ноччу трэба зазірнуць у хлеў...

Затое, калі ўвечары варочаецца з гораду, да возу павінен быць прымацован каганец. ТАКІ ЗАГАР ПАЛІЦЫІ. ІНАКШ — КАРА».

Гэта карэспандэнцыя эндэцкага органу камэнтараў не патрабуе. Праўда, «Газэта Варшавска» не гаворыць аб тым, што «пшаднувэк», бясхлебіца, «час пустых гумнаў і сьвірнаў» фактычна не пачынаецца і не канчаецца, **бо пануе непадзельна круглы год.**

Яшчэ адну «дэталь» становішча ў вёсцы абыходзяць магільным маўчаньнем паны-эндэкі, як і ўся буржуазная «грамадзкая думка»: гэта тое, што пад сялянскімі стрэхамі, пад якімі ўсеўладарна панове голад — неадлучны спадарожнік капіталістычнай сыстэмы, — пад гэтымі стрэхамі нарадзілася грознае дзецішча—рэвалюцыйны гнеў, палкае жаданьне змагацца з ладам хранічнага голаду, падткаў, тэрору і вайны.

Сёньня па ўсёй краіне коціцца магутная хваля баявых сялянскіх выступленьняў. Сяляне гоняць проч сакрэстратараў, паліцыю, ня плацяць падаткаў, ня выходзяць на прымусовыя работы-шарваркі. **Пад гегемоніяй пралетарыяту, пад кіраўніцтвам кампартыі, найшырэйшыя масы сялянства Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны гераічна змагаюцца за рэвалюцыйны выхад з крызісу.**

В. Т.

Камсамольская канфэрэнцыя пагранаховы і войск АДПУ БССР закончыла сваю работу

* 7 мая канфэрэнцыя заслухала заключнае слова тав. Герцовіча і даклад тав. Навумава аб чарговых задачах камсамольскай арганізацыі пагранаховы і войск АДПУ.

Па дакладзе тав. **Навумава** шырока разгарнуліся спрэчкі, у якіх выступаўшыя высоўвалі рад практычных задач па далейшым павышэньні баявой магутнасьці пагранічных часьцей.

* На вячэрнім пасяджэньні 7 мая па канфэрэнцыі выступіў з прамовай першы сакратар ЦК КП(б)Б тав. **Гікало.** Зьяўленьне тав. Гікало на трыбуне суправаджалася бурнай авацыяй.

Вітаючы ад імя ЦК КП(б)Б пагранічнікаў-чэкістаў, тав. Гікало характарызуе міжнароднае становішча Савецкага саюзу і вызначае тыя задачы, што стаяць перад пагранічнікамі—пільным дазорам пралетарскай дыктатуры.

* У апошні дзень работы — 8 мая—па канфэрэнцыі прагнтвалися спрэчкі па дакладу тав. Навумава.

Гучнымі воплескамі дэлегаты сустрэлі зьяўленьне на трыбуне тав. **Смаленскага,** які вітаў канфэрэнцыю ад імя палітычнай управы акругі.

* На вячэрнім пасяджэньні канфэрэнцыя прыняла рэзалюцыі па дакладах ЦК ЛКСМБ і тав. Навумава. Ажыцьцяўленьне пастаноў канфэрэнцыі на аснове ўзаемнай дапамогі паміж грамадзянскімі арганізацыямі камсамолу і арганізацыямі пагранічных часьцей забясьпечыць яшчэ большую выразнасьць у рабоце пагранічнікаў-чэкістаў, павысіць баявую падрыхтаванасьць камсамолу фабрык, заводаў і калгасаў БССР да абароны краіны.

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

Заканчваецца сушка агрэгату № 2

КІЧКАС, 7. Сушка агрэгату № 2 Дняпроўскай гідраэлектрастанцыі ідзе пасьпяхова і канчаецца.

Праз некалькі дзён другі агрэгат будзе зусім гатовы для выпрацоўкі электраэнэргіі. Трэці з шарэнгі буйнейшых у сьвеце агрэгатаў Дняпроўскай гідраэлектрастанцыі будзе скора пушчан.

Заканчваецца мантаж 4-га генэратара, ударэмі тэмпамі рамантуецца 5-ты генэратар.



ДНЕПРАБУД. Рамонт крана.

1-ая ў СССР элеватарная капальня

ШЧОКІНА, 3. 3-та красавіка ўступіла ў строй першая ў СССР элеватарная капальня № 5. Элеватар, які складаецца з 300 каўшоў, прыводзіцца ў рух электраэнэргіяй, што дазваляе значна паскорыць выдачу вугалю.

Праектная магутнасьць капальні — 1.500 тон вугалю ў суткі, больш, чым зараз дае ўся Шчакінская капальня.

Закладаў Ташкенцкі тэкстыльны камбінат

ТАШКЕНТ, 6. Закладзены новы гігант — Ташкенцкі тэкстыльны камбінат. Закладзена першая чарга магутнасьцю ў 111 тыс. верацён. Да 1-га сьнежня будуць устаноўлены 3.264 ткацкіх варштатаў.

Запалены топкі першага ў СССР вопытнага сланцаперагоннага заводу

СЫЗРАНЬ. Першы ў Савецкім саюзе вопытны сланцаперагонны завод уступіў у строй. 2-га мая завод пасьля выпрабаваньня апаратуры даў першую смалу.

Выкананьне прамфінпляну лёгкай прамысловасьці БССР за красавік

Паводле вестак Наркамату лёгкай прамысловасьці, прадпрыемствы Наркамату выканалі прамфінплян за красавік на **93 проц.** Выпушчана прадукцыі на суму 30.312.700 руб.

Прадпрыемствы **Менскага раёну** выканалі прамфінплян за красавік на 87,7 проц., падсобныя прадпрыемствы далі наступнае выкананьне: тутэйшы «Пралетары» — 79,5 проц.; гарбарня «Бальшавік» — 105 проц.; абутковая фабрыка — 73,7 проц.; скурамалянтарэйная фабрыка—54,1 проц.; швэйная «Кастрычнік»—97,7 проц.; швэйная фабрыка імя Крупскай — 83,1 проц.; швэйная фабрыка імя 8-га сакавіка — 96,7 проц.; ФЗУ «КІМ» — 89,2 проц.; скарняжная — 80,6 проц.; галянтарэйная — 101,5 проц.; друкарня імя Сталіна — 89,9 проц. і шпалерная імя Варофскага — 79,2 проц.

Прадпрыемствы **Віцебскага раёну** выканалі вытворчую праграму на 90,7 проц., у тым ліку фармоцтны завод «Камінтэрн» — 90,1 проц., голкавая фабрыка—107 проц., гута «Ноўка» — 126,7 проц., ільнапрадзільная фабрыка «Дзьвіна» — 67,5 проц., панчошная фабрыка імя Клары Цэткін — 104,6 проц., панчошная «КІМ» — 108 проц., гарбарня — 122 проц., абутковая — 81,1 проц., ФЗВ абутнікаў—64,2 проц., швэйная фабрыка «Будзіт індустрыялізацыі»—86 проц., фабрыка «Прэфінтэрн» — 98 проц., ФЗВ імя Х-годзьдзя КІМ—67,7 проц. і друкарня «Камінтэрн»—96,7 проц.

Прадпрыемствы **Гомельскага раёну** выканалі плян на 106,7 проц., у тым ліку завод «Чырвоны хэмік» — 83,4 проц.; гарбарня «Пралетарскі шлях» — 99,2 проц.; абутковая фабрыка «Праца»—102 проц.; швэйная «Камінтэрн»—125,8 проц., запалкавая «Вэзувій» — 56,2 проц., фанэрны завод «Вэзувій» — 102,2 проц. і друкарня «Палесдрук» — 92,1 проц.

Прадпрыемствы **Магілеўскага раёну** за красавік выканалі сваю вытворчую праграму на 89,6 проц., у тым ліку гарбарня імя Сталіна — 101,7 проц., рымарная фабрыка — 73,8 проц., швэйная фабрыка імя Валадарскага — 93,1 проц., ФЗВ швэйнікаў — 58,3 проц. і друкарня імя Молатава — 83,8 проц.

Прадпрыемствы **Бабруйскага раёну** выканалі плян за красавік на 79,5 проц., у тым ліку гута «Камінтэрн» — 103,8 проц., швэйная фабрыка імя Дзяржынскага — 76,6 проц. і друкарня — 110,4 проц.

Прадпрыемствы **Барысаўскага раёну** выканалі плян на 106,1 проц., у тым ліку гута імя Доспбаля — 102,9 проц., запалкавая фабрыка «Перамога» — 104,1 проц., фанэрны завод «Бярэзіна» — 121,9 проц. і друкарня — 85,1 проц.

Быхаўская гута «Ільліч» выканала плян на 48,8 проц.; Крычаўскі трэйдавы завод на 185,7 проц.; Высачанская ільнапрадзільная фабрыка імя Карла Маркса — 91,2 проц.; Лоёўскі завод сухіх фарбаў — 85,7 проц.; «Дняпроўская мануфактура» — 78 проц.; Якаўлевіцкая бавоўняная фабрыка — 71,2 проц.; Рачыцкі ліпавы завод — 22,5 проц.; фанэрны завод «Дняпро» — 107,1 проц. і запалкавая фабрыка імя 10-годзьдзя Кастрычніка — 85,9 проц.

Сельгасмашыны

Завод «Чырвоны металіст» за 4 мая выпусьціў 13 карнярэзак, або 61,9 проц., 13 бульбамык — 61,9 проц. Усяго плян выкананы на 33,4 проц.

За 5 мая выпушчана 10 жмыха-драбілак, або 58,8 проц., 29 карнярэзак — 138 проц., 20 бульбамык — 68,9 проц. Усяго плян выкананы на [illegible]9 проц.

Будматар'ялы

Лесазавод «Спартак» за 4 мая расьпіляў 87 к. м. сыроду, што складае 106 проц. пляну. Цэментнай клёпкі выпушчана 856 камплектаў, або 94 проц. пляну.

***

Лесакамбінат «Камінтэрн» за 4 мая расьпіляваў 165,1 к. м. сыроду, што складае 92,3 проц., за 5 расьпіляванна — 210 к. м., або 94 проц. пляну.

***

Завод «Інтэрнацыянал» за 4 мая выпусьціў 369 кгр. цьвікоў, або 87,6 проц., 817 кгр. шрубаў, або 90,5 проц. За 5 мая выпушчана 348 кгр. цьвікоў — 85,5 проц. і 812 кгр. шрубаў — 92 проц.

Рэдакцыя газэты «Зьвязда» і ЦП саюзу грамадзкага харчаваньня склікаюць на 12 мая, у 8 гадзін вечара

нараду загадчыкаў сталовых у гор. Менску па пытаньні

АБ ТРУСАГАДОЎЛІ

Нарада заслухае даклад прадстаўніка Менкаапхарчу аб намечаных у гэтай галіне мерапрыемствах і абгаворыць практычныя пытаньні трусагадоўлі пры сталоўках.

На нараду павінны зьявіцца прадстаўнікі сталовых: жакту № 6 — тав. ЛЮСТЭРНІК і аматар-трусавод БУГАЕВА, загадчыкі сталоваи № 1 — т. САГАЛОЎ, № 2 — тав. АКСЭЛЬРОД, № 3 — тав. ХАЗАН, № 4 — ШАМОЭ, № 5 — РАГОЗІН, № 10 — КРЫВАШЭЕЎ, № 11 — АСОБСКАЯ, № 12 — ШУЛЬЦ, № 13 — ФРЫДЛЯНД, № 14 — ГУДЗІМАЎ, № 15 — КАПЦЭВІЧ, № 16 — ЯДГУР, № 19 — ОЗДЭР, № 21 — ФІШКІН, № 23 — ВОЙТАСЕВІЧ, № 25 — ГАДМАЕР, № 29 — БЭРНШТЭЙН, № 32 — ПАПКОЎ, № 34 — ХІВОВІЧ, № 35 — МАКСІМЭНКА, № 37 — КАЗАК, № 40 — ХОЦІН, № 41 — МАЧАЛЬСКІ, № 43 —БЯСПРЫЗВАНЫ, № 44 — ХАРЫТОНЧЫК, № 48 — ВОЛЬПЭР, № 49—МЭЛЬЦАР, № 50 — ШАРШУН, № 52 — ШАТКОЎСКІ, № 57 — НЕКРАШ, загадчыкі усіх сталовых ТСТ чыгуначнікаў, прадстаўнікі Белкаапхарчу, харчэжцкі ТСТ чыгуначнікаў, усіх ЗРК і ЗВК.

Калі па якой-небудзь прычыне асобныя загадчыкі зьявіцца ня могуць, абавязкова прысутнасьць іх намесьнікаў.

Нарада адбудзецца ў габінэце рэдактара «Зьвязды» (Савецкая, 63, 3-ці паверх).

РЭДАКЦЫЯ «ЗЬВЯЗДЫ».
ЦП САЮЗУ ГРАМАДЗКАГА ХАРЧАВАНЬНЯ.

1-я сэсія ДВС БССР

ДРУГАЯ ПЯЦІГОДКА І ЗАДАЧЫ КУЛЬТУРНАГА БУДАЎНІЦТВА

З дакладу тав. ПЛАТУНА

На першым пасяджэньні сэсіі Дзяржаўнага Вучонага Савету з дакладам **аб другой пяцігодцы і задачах культурнага будаўніцтва** выступіў Нарком Асьветы тав. **А. М. Платун.**

У пачатку свайго дакладу тав. **Платун** указвае, што БССР зараз знаходзіцца на крутым уздыме культурнай рэвалюцыі. Дакладчык падкрэсьлівае вялізарнае **палітычнае і практычнае** значэньне пастановы апошняга аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б аб нацыянальна-культурным будаўніцтве.

Да 1 мая г. г.,—кажа тав. Платун,—мы ставілі перад сабой цяжкую і складаную задачу—завяршыць суцэльную пісьменнасьць. І гэту задачу мы ў асноўным **выканалі.** На сёньняшні дзень у нас засталося яшчэ 50 тыс. няпісьменных дарослых, або 2 проц. у адносінах да ўсяго насельніцтва ва ўзросьце да 50 год.

У спадчыне-ж ад царызму мы атрымалі 70 проц. няпісьменных. Цяпер, у заключным годзе першай пяцігодкі, у нас засталося няпісьменных толькі 2 проц. Гэта параўнаньне само яскрава сьведчыць аб нашых перамогах на фронце ліквідацыі няпісьменнасьці. Мы маем поўнае права абвясьціць БССР краінай, якая ў асноўным завяршыла суцэльную пісьменнасьць.

Партыя і ўрад аддаюць выключную ўвагу народнай асьвеце. Так, па рэспубліканскім буджэце на гэту справу вызначаецца 126 млн. руб., або 35 проц. усяго бюджэту. Па раённым-жа бюджэце амаль палова ўсіх сродкаў ідзе на народную асьвету.

У гэтым годзе мы закончым усеагульнае навучаньне ў разьмеры першапачатковай школы. Ужо распачалі і ў 1932-33 годзе разгорнем усеагульнае навучаньне ў разьмеры сямігодкі.

Атрыманы буйнейшыя дасягненьні ў галіне сярэдняй і вышэйшай адукацыі. БССР мае 112 тэхнікумаў розных спэцыяльнасьцяй і 32 ВНУ.

Такіх перамог мы дасягнулі дзякуючы Кастрычніцкай рэвалюцыі, дзякуючы правільнай генэральнай лініі партыі, у выніку пасьлядоўнага ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Палітычныя задачы другой пяцігодкі,—кажа далей тав. Платун,—ставяць перад намі асабліва вялікія задачы, адкрываюць асабліва вялікія перспэктывы. Апрача ўсеагульнага навучаньня ў разьмеры сямігодкі, мы намячаем ужо ў 1933-34 годзе ўвядзеньне ўсеагульнага навучаньня за дзевяцігодку і гэтым самым практычна вырашым задачу, пастаўленую ў праграме партыі—працягнуць палітэхнічную асьвету да 17-гадовага ўзросту.

Далейшая разгорнутая работа па сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадркі прад'яўляе асабліва вялікія запатрабаваньні да падрыхтоўкі кадраў масавых кваліфікацый. Тут мы павінны біцца і за колькасьць і, асабліва, **за якасьць** нашых кадраў.

Ажыцьцяўленьне задач другой пяцігодкі будзе праходзіць ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы. Мы зможам з посьпехам будаваць нашу нацыянальную пралетарскую культуру толькі пры ўмове **далейшай бязьлітаснай барацьбы з клясавым ворагам і яго апартуністычнымі агентамі.**

Другая пяцігодка—будзе пяцігодкай пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва, ператварэньня ўсіх працоўных у актыўных і сьвядомых будаўнікоў сацыялізму.

Задача Наркамасьветы, ДВС, і ўсіх органаў Народнай асьветы—узьняць сваю работу на ўзровень палітычных задач другой пяцігодкі, усямерна садзейнічаць выканаьню важнейшых дырэктыў партыі.

Тав. Платун большую частку свайго дакладу адводзіць пытаньням работы масавай школы і рэалізацыі пастановы ЦК УсеКП(б) аб сярэдняй і пачатковай школе. Кажучы аб тым, што на аснове ажыцьцяўленьня пастановы ЦК партыі, у рабоце школы дасягнут некаторы зрух, дакладчык з усёй сілай падкрэсьлівае, што якасьць навучаньня ў нашых школах застаецца яшчэ нізкай.

У канцы дакладу тав. Платун падрабязна спыніўся на задачах далейшага ажыцьцяўленьня пастановы ЦК партыі аб школе і на тых пытаньнях, якія стаяць у сувязі з гэтым перад Вучоным Саветам, перад усімі работнікамі марксыцка-ленінскай навукі.

ХРОНІКА СЭСІІ

Па заслуханым дакладзе. т. ВАЛЬФСОНА АБ ДВС І ЯГО ДАЛЕЙШАЙ РАБОЦЕ разгарнуліся шырокія спрэчкі. Навуковы сакратар ДВС РСФСР т. ДАНІЛАЎ падзяліўся на сэсіі багатым вопытам работы старэйшага вучонага савету ў Савецкім саюзе. Цэлы рад акадэмікаў і прафэсароў нашых ВНУ і ВТНУ выступілі з цікавымі прамовамі.

1-й сэсіі ДВС рапартавалі студэнты ВНУ аб сваёй рабоце і вучобе.

8 мая ўдзень працавалі камісіі. На вячэрнім пасяджэньні заслухан даклад тав. БАРШЧЭЎСКАЙ аб далейшай рэалізацыі пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб пачатковай школе.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

10 мая, у 10 гадзін раніцы, у пяцімясьцовай рэдакцыі „Зьвязды"

АДБУДЗЕЦЦА

ПАШЫРАНАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ

Цэнтральнай конкурснай камісіі

ПА КІРАЎНІЦТВЕ АБВЕШЧАНЫМ „ПРАВДОЙ" КОНКУРСАМ НІЗАВЫХ ГАЗЭТ КАЛГАСАЎ, САЎГАСАЎ І МТС НА ЛЕПШУЮ РАБОТУ ПА АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧЫМ УМАЦАВАНЬНІ КАЛГАСАЎ.

НА ПАРАДКУ ДНЯ:

1. Даклады раённых газэт: Заслаўскай, Койданаўскай, Лагойскай, Вузьдзенскай.
2. Даклад Менскай гарадзкой конкурснай камісіі.
3. Даклады ўсіх калёнаважатых аб іх кандыдатах на сацыялістычнае пярэдніцтва.

Яўка для ўсіх часнаў цэнтральнай конкурснай камісіі абавязкова.

Цэнтральная конкурсная камісія.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"

Ад аўторка, 10 мая

новы гукавы гаэрашчы мастацкі фільм

ВАМ ЗНАЙДЗЕЦЦА РАБОТА

Рэжысэр І. ТРАУБЭРГ. Музыка В. Багданова-Беразоўскага

У гал. ролях:—С. МАГАРЫЛ, М. ШТРАУХ, Ф. НІКІЦІН, Н. МІЧУРЫН

Эпізод І. Нікай жыве парадзк, ІІ. Франц нікоча паліцыі, ІІІ. Франц робіць злачынства, IV. Франц шукае справядлівасьці.

Эпіз. V. Пра Францу гаворыць і сьпяваюць, VI. Франц пратэстуе, VII. Франц нарушае парадак.

ШТОДЗЕННА 4 СЭАНСЫ.

Пачатак у 5-30, 7-15